# САФІЯ МАКАРЭВІЧ



Сафія МАКАРЭВІЧ

# САЛОН
# ДЛЯ ЦІКАВЫХ ЛЮДЗЕЙ

Гумарэскі



Мінск
2002

**Макарэвіч С.**
Салон для цікавых людзей. Гумарэскі.
2002. — 120 с.

Сафія Аляксандраўна Макарэвіч нарадзілася ў Мінску. За плячыма ў яе, быццам крылы Пегаса, — медінстытут і клінічная ардынатура. Па прафесіі — урач-кардыёлаг, аўтар шэрагу навукова-папулярных кніг пра здароўе.

Аднак згадка пра Пегаса зусім не выпадковая: Сафія Аляксандраўна выдала рускамоўны зборнік вершаў «Тайна белого листа». І вось — «Салон для цікавых людзей». Гэта не проста выбітная кніга гумару, а хутчэй — адмысловы збор «рэцэптаў» самай найлепшай цалебы для спакутаванай душы нашага сучасніка: не розныя там зёлкі ды напоі-адвары, а старонкі непасрэднага досціпу, што выклікае не толькі ўсмешку ды здзіўленне, але нясе ў сабе і святло даверу, змушае на памяркоўнасць.

© Макарэвіч С., 2002



*Усміхнемся адзін аднаму,*
*пасмяемся з саміх сябе —*
*і палягчэ.*



# ДЖЭНТЛЬМЕНСКІЯ ПАКУТЫ

Пачынаючы камерсант Аркадзь Бурбуць утульна ўладкаваўся на сядзенні тралейбуса, дастаў з кішэні ўчарашнюю, крыху пакамечаную газету, паправіў акуляры і ўпёрся вачыма ў артыкул на першай паласе. Чытаць падчас руху было не вельмі зручна, дый, прызнацца, не было як засяродзіцца, бо апошнім часам у яго прадпрымальніцкай дзейнасці выявілася даволі шмат падводных камянёў, якія аніводны добры дзядзька за яго не раскідае.

Якраз набліжаўся час «пік» — народу ў тралейбус набілася «пад завязку», але чалавек з газетай выглядаў паважна і нават інтэлігентна. Тым больш, што навокал яго стаялі адно жанчыны, і чулае сэрца Аркадзя Бурбуця болем адгуквалася на такую несправядлівасць. О, ён быў ахвочы да жанчын. Ды апошнім часам не надта перад імі шапкаваў. Вядома ж, на ўсё ёсць свае прычыны...

Калі шчыра, дык у свае няпоўныя трыццаць два спадар Бурбуць паспеў ужо змяніць дзвюх жонак. Ну, канешне, трэцюю з яго вопытам нялёгка выбраць. Таму не без цікавасці прыглядваўся як не да кожнай прадстаўніцы з гэтай самай, на яго думку, не горшай паловы чалавецтва, заўсёды нібы вырашаючы: каго б нарэшце-такі па-сапраўднаму ашчасліваць?

А ўсё ж — гэты раз сядзеў ён надзіва ёмка, прывольна і стараўся не ўспрымаць навакольную

нервовасць ды мітусню жаночых паглядаў, бо даўно быў перакананы, што сядзець куды лепей, чым стаяць, а ляжаць — лепей, чым сядзець... Аксіёма! «Ну так, лепей ляжаць. — Смакотна зыркнуў на суседку. — Ніштаватая, гм... З такой не грэх і паляжаць...» — І зноў торкнуўся носам у разгорнутую газету, засяродзіўся.

Тралейбус ляснуў дзвярыма, скрануўся з месца, яшчэ бадай і не набраў хуткасць, як Аркадзь Бурбуць акурат ля свайго носа ўбачыў прывабную жаночую далоньку з гожымі пальцамі, пярсцёнкамі на іх; далонька раптам павярнулася тыльным бокам — і стала відаць наманікюраныя пазуры, вузкія і доўгія. Рука дагледжаная, абаяльна бялюткая ўся, але ж, падобна, і моцная, бо надта ж чэпка ашчаперыла металічны поручань сядзення. А яшчэ на пяшчотным запясці вісела даволі вялікая сумка, напоўненая, вядома ж, харчам, сярод якога, відаць, было колькі пляшак з малаком ці кефірам, бо тыя лёгка цокаліся адна аб адну, шкляна пазваньвалі.

Аркадзь трымаўся мужна — не выдаваў сваёй пільнай зацікаўленасці, каб — крый Божа! — жанчына не ўбачыла яго памкненняў. Агляд мусіць быць асцярожны, бо ўладальніца такой прыгожай ручкі — красою, няйнакш, недзе блізкая да самой Джаконды. Ха! У другой руцэ маладзічка трымала не меншую сумку, ад якой несла ці не вэнджанай каўбаскай — прыемны пах.

Ды вось — нешта з тралейбусам сталася: пачаў раптам падскокваць і віхляць. Раней Аркадзь абураўся на дарожнікаў, што цягнуць з рамонтам вуліцы, а

тут быў нават удзячны лайдакам-рамонтнікам, бо пры кожным падскоку тралейбуса жанчынку кідала туд-сюд, і яна ўсё больш і больш хінулася да Аркадзя. Здаецца, дасягла свайго, бо ўжо добра стала чуваць цяпло яе мяккага клуба...

Думкі Бурбуця пайшлі ў іншы бок. Ён адчайна глянуў уверх — кінуліся ў вочы павабныя пухіры яе поўных грудзей, а яшчэ вышай, акурат на фоне белай столі тралейбуса, добра глядзеўся наўздзіў мілавідны твар суседкі. Аркадзь на хвілію забыўся пра канспірацыю — назіраў і думаў: «Бальзакаўскага ўзросту... У-у, і не зачуханая, дагледжаная. Усё пры ёй... І, калі што, забуяе жанчынка ўсімі колерамі вясёлкі. То што ж мне рабіць — рашуча пайсці ў наступ? — Аркадзь адчуваў сябе ніякавата, ён і раз ёрзнуў на сядзенні, і другі. — Стой, конік, стой: з такой не будзе спакою — затурзае і ў ложку, і па-за ложкам... Ад «бальзакаўкі» не ўцячэш — расшукае і кухталёў надае. Дый малады я для яе — дзяцюк... Ат, манюка — сам сабе няпраўду кажу: не маладзён ужо, лысіну відаць не ўзброеным вокам, ногі часам так гудуць, так косткі трашчаць, хоць на чарэнь кладзіся. От, убакі стала заводзіць... Вырашай хутчэй!»

Аркадзь усё яшчэ трымаў перад вачыма газету, нават перагарнуў старонку, але думкі, як крыгі падчас паводкі, лезлі адна на адну, церліся. Ехаць яшчэ недзе прыпынкаў пяць. Ён ужо добра разглядзеў жанчыну, нарэшце вынес-такі прысуд: «Не маладая, але і не старая... Бландзінка, вейкі сінія, а вусны ярка-чырвоныя, зрэшты, як і пазуры на пальцах. О, бач, прыляпілася, прыціхла... Але ж, відаць, кабетка дужа спрытная — плячук такой жарсцю паліць, так

прабірае, што аж сэрца заходзіцца. — Ён троху адсунуў газету ўправа і засяродзіў свой позірк на пальцах, што ўсё яшчэ сціскалі поручань. Пачырванелыя — ад напружання, мусіць: дай-ка так трымацца! А тут яшчэ гэтыя торбы цяжкія... Рашайся, Аркаша, хапай шчасце аберуч і не адпускай — і ўсе прысмакі, ёй здабытыя, тваімі будуць. Гэтая мадонна і накорміць, а пасля і душу знойдзе як пацешыць. Гаспадарлівасць упрыгожвае жанчыну!»

Тралейбус падскочыў так, аж моцна ляпнула недзе пад днішчам салона. Жанчына ледзь утрымала свае сумкі, але з месца, праўда, не скранулася. «У-у, устойлівая, дзябёлая... Такая і кахаць будзе горача, і карміць смачна, — радасна падумаў Аркадзь і бадай што насілкам адарваў свой рашуча-памаўзлівы зірк ад суседкі. — Спёкся папуас — выкрыла... Эйш, не ловіць варон, натура тонкая!»

Жанчына — канешне ж! — раскрыла яго кансператыўнасць: вочкі так і заярчэлі спакусай, шчокі, як падалося, зайшліся лёгкай барваю. Позіркі іх на хвілю перакрыжаваліся, і Аркадзь праз свае акуляры ўбачыў не толькі сінечу яе круглых, як маленькія поўні, зрэнкаў, але і ледзьве ўлоўную збянтэжанасць і патаемную надзею, ад чаго глыбіня ейных зрэнкаў троху нават зменшылася. Падумаў: «Бач, правакуе — гіпнозам хоча ўзяць... Не паддамся! — І зноў унурыўся ў газету, разважаючы: — Ну што за народ, гэтыя жанчыны?.. Так і чакаюць, каб лапкі паказаў: маўляў, здаюся, абрытвай...»

Неўзабаве Аркадзь пачуў, як вадзіцель назваў прыпынак, дзе яму трэба выходзіць. Схамянуўся і заціх у роздуме, затым рашуча падняўся, глянуў у стомленыя вочы жанчыны й суцешна пасміхнуўся:

— Сядайце, калі ласка, — па-джэнтльменску паказаў на свабоднае месца. — Сядайце...

Газету не было калі складваць — ён проста скамечыў яе і, калі выхапіўся з тралейбуса, кінуў у сметніцу.



# ІНКОГНІТА

Як вядома, шчасце кожнага залежыць у першую чаргу ад здароўя. Бо здароваму чалавеку патрэбна літаральна ўсё, а хвораму — толькі здароўе. А яно, здароўе, у нейкай сваёй частцы залежыць ад нашых дактароў. Самае найбольшае задавальненне хворы атрымлівае, калі нарэшце ўдаецца яму збавіцца ад надакучлівай хваробы.

Таму чэргі ў раённай паліклініцы — з'ява звычайная, хаця і непрыемная. Канешне, хацелася б патрэбны рэцэпт на здароўе атрымаць адразу і без праблем, але гэтае ўсё — з вобласці фантастыкі.

Перад кабінетам тэрапеўта народу сабралася багата. Хто сядзеў, хто стаяў. Былі сярод маладых мужчын і жанчын бабулі й дзяды, з кіёчкамі ды планкамі медалёў на пінжаках. Нехта моўчкі сядзеў, гледзячы панура ў падлогу, нехта чытаў газету. А тыя, хто быў знаёмы адно з адным, сустрэўшыся, і, каб марна не траціць час, вельмі шчыра і зацікаўлена абменьваліся праявамі сваіх хвароб. Не дзіўна — для хворага чалавека знайсці сабе падобнага, з аднолькавымі сімптомамі сваёй самай цяжкай, самай непрадказальнай хваробы — гэта ўжо значная палёгка. З асалодай пералічваць свае скаргі, удакладняць, звяраць, вынаходзіць новыя, невядомыя сродкі ад немачы, дзяліцца рознымі інтымнымі падрабязнасцямі — такое магчыма адно перад кабінетам доктара.

Трэба сказаць, не цураюцца людзі медыцынскай тэматыкі таксама і ў грамадскім транспарце, і ў

тэатры, але тут, у чарзе да свайго доктара, адчуваць, што нехта пакутуе не менш за цябе — сапраўднае збавенне ад цяжару будзённых непрыемнасцяў. Для хворага няма большага шчасця ведаць, што ты — не адзіны такі...

І праўда, ішлі ў ход чутыя і апрабаваныя рэцэпты з часнаку і буракоў, бульбянага лушпіння і гароху, яны запісваліся ў спецыяльныя нататнікі, альбо на звычайныя аркушыкі паперы, што траплялі пад руку.

Варта прыслухацца — і чуеш:

— Вы бурачковы сок п’яце?

— Не.

— Што вы?!. Як можна!

— А без яго нельга?

— Ну, канешне!.. Трэба абавязкова піць — ціск зніжае, ад пухлін засцерагае... І ад запору — першы сродак!

— Ну, з сокам бурачковым ясна... А вы памаліцца не забываецеся перад ужываннем зёлак?

— Не ведаю малітваў... Не вучылі нас гэтаму.

— Дыктую — запісвайце!..

Збоч ад усіх, у кутку, бадай пад фікусам, сядзеў даволі яшчэ малады мужчына ў зацемненых акулярах, пры гальштуку. На каленях ляжала разгорнутая чорная папка з паперамі, куды ён нешта ўсё раз-пораз запісваў шарыкавай ручкай. Паводзіў сябе гэты чалавек так, нібы яго ну зусім не кранаялі турботы ўдзельнікаў блізкай ад яго чаргі. Тым часам каля дзвярэй тэрапеўта ўсчалася сварка:

— Не-не, вы стаялі не перада мной, а за мной...

— А мне здавалася, што не я за вамі, а вы — за мной. І квіток у мяне на дзесяць гадзін, а дзе ваш, пакажыце?

— Вы што — смеяцеся?.. Праспалі свой час — ужо без пяці адзінаццаць. Дзе швэндаліся?

— Я на хвілінку адвярнулася, — зайшлася ад злосці жанчына. — Не было тут вас!.. Сам недзе швэндаўся, а да мяне чэпішся — не дам без чаргі праскочыць. Не пушчу!

Такія палымяныя перапалкі сведчылі аб тым, што рэзервы здароўя ў людзей не вычарпаныя, і ёсць яшчэ, як кажуць, порах у парахаўніцах, бо пры адсутнасці гэтага запальнага рэчыва наўрад ці хапіла б у хворых імпэту на такія дападныя дыялогі.

Мужчына па-ранейшаму нешта ўсё занатоўваў, на хвілю рука яго пераставала парыўна турзацца, і тады ён задумліва пазіраў то ў акно, то на чаргу-вужаку, што бясконца варушылася і шыпела. Праўда, калі нечакана прабегла паўз яго маладая медсястра, ён струнка выстарчыў шыю, засяродзіўся і пільна сачыў за дзеўчынёхай у беласнежным халаціку, аж пакуль тая не знікала з вачэй.

Гэта была Вольга. Яна выхапілася з кабінета, як з поля бітвы, каб прынесці з лабараторыі аналіз, які чамусьці ўсё яшчэ не перадалі доктару. Канешне ж, убачыла «занатоўшчыка» і мусіла тут жа паведаміць пра яго ўчастковаму доктару Ангеліне Мікалаеўне, якая адначасова была і старшынёй прафкама.

— У куточку... Ну так, каля нашага кабінета... Сядзіць і нешта хуценька штрапаліць. Яўна не хворы.

— На калідоры — пад фікусам?.. — насцярожылася Ангеліна Мікалаеўна. — І піша, кажаш? — Яна нават на нейкі момант перастала праслухоўваць лёгкія хвораму, а той натхнёна і глыбока працягваў дыхаць адкрытым ротам.

— Паглядзіць, падумае — і строчыць. Так хутка... Вельмі хутка.

— Можа, карэспандэнт з газеты якой? — уцяла голаў у плечы Ангеліна Мікалаеўна. — Цяпер жа газет гэтых развялося... Хіба скаргу хто даслаў, га? О-о, ён тут можа такое пачуць, такога назапісваць... Эйш, нікому не прадставіўся, сеў і ўсё фіксуе, кажаш?

— Ну, сядзіць... І рука яго так і ходзіць!

— Вольга, а які ён з выгляду? — усхапілася Ангеліна Мікалаеўна з крэсла. — Што сабой уяўляе?

— Я мяльком на яго глянула, — разгубілася сястрычка. — З выгляду — інтэлігентны, у цёмных акулярах.

— У цёмных?!. — збянтэжылася старшыня прафкама. — Гэта — ён!

— Хто?.. — утрапёна лыпнула вачыма Вольга. — Вы яго ведаеце?

— Не бачыла ні разу, але шмат пра яго чула... З'явіўся новы начальнік у нашым міністэрстве. Нікому не давярае — праверкі робіць сам, інкогніта. Разумееш?

— Ой, не зусім...

А хворы тым часам ужо троху агойтаўся — дыхаў спакойна і праз нос, з цікаўнасцю прыслухоўваючыся да таямнічай гаворкі.

— Так, гэта яго тактыка, — буркавала сабе пад нос Ангеліна Мікалаеўна, не зважаючы на свайго пацыента. — Гэта ён, Аркадзь Канстанцінавіч... Ходзіць як звычайны хворы па паліклініках, слухае, назірае, скаргі розныя выдумляе, а потым — дае адзнаку дзеянням медперсаналу... Жах!

— Я таксама чула... — Вольга ажно плячыма цепнула. — Мая сяброўка ў суседняй паліклініцы ў рэгістратуры робіць. Дык Аркадзь Канстанцінавіч каля васьмі гадзін вечара пастукаў у акенца і сказаў, што сэрца прыхапіла, папрасіў кардыяграмку зняць...

— Каля васьмі гадзін? — сцярожка перапытала Ангеліна Мікалаеўна. — І яны ўсе на месцы былі?

— Былі, але ўжо апранутыя... Параілі патэлефанаваць па 03, бо ўсе ўрачы ўжо дамоў пайшлі, а кардыяграмы толькі да пяці здымаюць, па талонах.

— А ён?

— Застагнаў перад акенцам... Кажа: «Ніякіх лекаў няма з сабой, дапамажыце...»

— І не дапамаглі... Нам на планёрцы пра гэта расказвалі. О-о, яны ўсе там па вымове адхапілі, галоўурача знялі з пасады... Так, Вольга, слухай сюды, — рашуча сказала Ангеліна Мікалаеўна. — Робім выгляд, што ні аб чым не здагадваемся... Інвалідаў і ветэранаў вайны скіруй адразу да мяне — імі сама займуся. Так і скажы, што яны, ільготнікі, абслугоўваюцца без чаргі... Ён пачуе, бо ўсё ловіць, ва ўсё нос точыць.

— Ой, іх там нямала, — разгубілася Вольга, — нават не ведаю...

— Спачатку — удзельнікаў да мяне, потым — інвалідаў... Я тут з імі хуценька разбяруся, мне вопыту не займаць.

— А тыя, у каго тэмпература?

— Іх ужо вы там самі... Пастаў усім градуснікі, скажы, каб трымалі не менш як пятнаццаць хвілін, і ў каго зашкальвае — на прыём у першую чаргу.

— Ой, Ангеліна Мікалаеўна, яны ж усе ў першую чаргу...

Вольга пад лямант і нараканні хворых даволі хутка зрабіла патрэбную «ракіроўку». Яна ласкава ўсміхалася, гаварыла гэтак жа ласкава і пяшчотна. І хворыя неўзабаве глядзелі на рахманую сястрычку з даверам і ўдзячнасцю. А правярака пад фікусам па-ранейшаму быў насуплена-незадаволены й задуменны, занатоўваць не пераставаў.

Вольга паспяшалася суцешыць участковага ўрача, не сказала — апаліла нібыта агнём:

— Ангеліна Мікалаеўна, з чаргой, быццам, усё ў парадку... Але ён — піша.

— У калідоры брудна... Я казала Яўсееўне, каб хоць раз у тыдзень падлогу мыла з хлоркай, а яна хіба слухае каго... Ёй галоўны ўрач не аўтарытэт. Расшукай яе, Вольга, чуеш?.. Няхай як след вымые наш калідор.

— Яўсееўна на Камароўку па вясковае малако паехала... І вы ж заказалі, і ўсе мы... Пасля ёй па гарачы хлеб бегчы трэба. — Вольга матнула галавой і ад здзіву ажно ў ладкі пляснула: — І як толькі яна паспявае ўсё рабіць... Гэта ж і ў аптэцы таксама лічыцца прыбіральшчыцай.

— Бяжы да галоўнай, няхай сама шукае выйсце... Мне няма часу, бачыш, чарга... Не стой, Вольга, бяжы.

Яўсееўны, канешне, не знайшлі — яе падмяніла маладзенькая практыкантка з пятага паверху. Хуценька і падлогу вымыла, і не забылася нават пыл змахнуць з падаконнікаў.

А мужчына-інтэлігент усё пісаў. І па-ранейшаму моршчыў лоб, быў нечым незадаволены. Цяпер ужо ўсе дакладвалі непасрэдна галоўнай медсястры пра паводзіны правяральшчыка.

— Марыя Патапаўна, я ўсё зрабіла, як вы казалі, але ён не перастае пісаць... Паглядзеў на мяне — і тут жа на акно стаў зіркаць.

— А яно хоць чыстае?

— Я збольшага працерла... Але не ўсё, а як дастаць.

Нарэшце быў праінфармаваны галоўны ўрач паліклінікі. Марыя Патапаўна не падбірала слоў — вымавіла з ходу і наўпрост:

— Трэба хуценька вымыць акно ў калідоры на другім паверсе... Там сядзіць пад фікусам нейкі правяраючы, мусіць, з міністэрства, і ўсё запісвае.

— Піша?.. — заклапочана насупіў бровы галоўны. — Так, гэта яго метода... Бач, цішком прыйшоў і вышуквае нашы недахопы. А потым — па цемячку... Патапаўна, а калі там і хто мыў вокны?

— На мінулым суботніку ўрачы з медсёстрамі.

— Не, суботніка доўга чакаць... Нешта прыдумаем.

І прыдумалі — адмянілі заняткі ўрачэбнай фізкультуры, і маладая дакторка спартыўнага целаскладу, узброіўшыся швабрай з доўгім цапільнем, анучамі ды газетамі, вельмі акуратна і нават педантычна-старанна мыла акно.

А мужчына-інтэлігент сядзеў на ранейшым месцы. Аўтаручка хадуном хадзіла ў яго правай руцэ — пісаў чалавек апантана, без стомы. Ды нечага часцей пачаў зіркаць у канец калідора — яўна на процілеглае акно.

Далажылі намесніку па АХЧ:

— Ведаеце, на другім паверсе сядзіць правяраючы з міністэрства, інкогніта, і запісвае ўсе нашы недахопы... Будзе нам тое ж самае, што і нашым суседзям. Чарга да нас дайшла.

Як было ў суседняй палікдініцы ведалі ўсе.

— І да чаго ён больш за ўсё прыглядаецца — не заўважылі? — Намеснік па АХЧ мітусліва падняўся з-за стала і агледзеў прысутных. — Мурзы, гэта хіба халаты?!. Замяніць зараз жа! Лапленыя, не прасаваныя...

— А што вы не ведалі раней, як нам бялізну мыюць? То грошай, каб расплаціцца з пральняй, няма, то машына без паліва стаіць...

— Для другога паверха даю халаты з НЗ... Праз дзесяць хвілін каб усе былі ў новых!

І праўда, бадай што ўклаліся ў прызначаны тэрмін — і медсёстры, і ўрачы з другога паверха красаваліся ў новых халатах, адпрасаваных і накрухмаленых, а даўганогай і спрытнай Вользе дастаўся нават нейлонавы.

Нечакана ў дынаміку, што быў на калідоры непадалёку ад кабінета тэрапеўта, пачуўся ціхі пошум, а следам — пяшчотны жаночы голас абвясціў:

— Паважаныя наведвальнікі нашай паліклінікі, паслухайце чарговую санітарна-асветніцкую перадачу на тэму: «Як збавіцца ад сонечных апёкаў?»

Хаця на двары стаяў канец сакавіка і тэма яўна была не па сезону, аднак усё сведчыла аб тым, што жыццё ў паліклініцы кіпіць-віруе і пацыенты мусяць быць усім задаволеныя.

А мужчына ў бездакорна-шыкоўным гарнітуры заставаўся сядзець у куточку, каля фікуса, і час ад часу паглядаў то ў канец калідора, то ў столь — акурат у тое самае месца, адкуль звісала доўгая павуціна. Праўда, ні Вольга, ні Ангеліна Мікалаеўна павуціну не заўважалі. Іх страшна дзівіла тое, што гэты інкогніта ўсё яшчэ працягваў сядзець з папкаю на каленях і не пераставаў весці запісы. Прынцыповы!

— Правяраць заўсёды лягчэй, чым працаваць. — Ангеліна Мікалаеўна вызірнула з кабінета і з палёгкай уздыхнула: на калідоры хворых ужо і блізка не было. А ён, гэты правяральшчык чортаў, усё яшчэ тырчаў. Яна зайшла ў кабінет тэрапеўта Зосі Аркадзьеўны, стомленай, але вясёлай, бо хворыя засталіся ёй задаволеныя, дзякавалі за ўвагу і клопат. — Нешта з ім трэба рабіць... Ён твой, Зося, выйдзі, ветліва пагавары, а то можа такога наплявузгаць...

— Не-е, Ангеліна Мікалаеўна... Я не ўмею, у мяне не атрымаецца. Гэта — ваш кліент, вы — прафсаюз... Вам і карты ў рукі.

Ангеліна Мікалаеўна рашуча выйшла з кабінета, скіравала свой позірк на мужчыну ў чорных акулярах і рашуча спытала:

— Вам хіба зручна гэтак пісаць?.. Дый няўтульна. Можа, у кабінет прайшлі б, га? Прыём хворых ужо закончыўся... Так што, калі ласка, заходзьце. Мы троху адпачнем ды разыдземся... У мяне яшчэ пяць візітаў на даму.

— Як вы сказалі?.. Ну правільна — візіт! — Мужчына ажно падскочыў, твар яго засвяціўся. — А я ламаю галаву — візіт, канешне.

— Так, візіты, — занепакоілася Ангеліна Мікалаеўна. — Што-небудзь не так? У вас да нас ёсць нейкія пытанні, прэтэнзіі?

— Ды не-е... Вы мне ўжо дапамаглі, дзякуй, — прыязна пасміхнуўся мужчына. — Я тут жонку чакаю, яна ў кансультацыі нейкія там працэдуры прымае... А мне сярод жанчын няёмка было, дык вось, бачыце, у гэтым кутку засяродзіўся над красвордамі. Ужо трэці заканчваю, а супругі ўсё няма. Як усё роўна

забылася, што мне на завод трэба, я там майстрам працую... О-о, тут я паглядзеў, наслухаўся... Праца ў вас цяжкая — усё бегаеце, чысціце, мыеце ды яшчэ і людзей паспяваеце лячыць... Не-е, на заводзе куды спакайней. Дзякуй вам за клопат... О! Вунь і маё шчасце паказалася, шукае... Такія чэргі ў вас, людзі пажылыя, нервы... Нялёгка вам... Да пабачэння!

Мужчына хуценька зашпіліў папку, падняўся і, як не ўподбежкі, патрусіў насустрач жонцы.



## АКТУАЛЬНАЯ ТЭМА

Васіль Ступка прынёс неяк у рэдакцыю раённай газеты гумарэску. Нават не гумарэску — гумарэсачку. Ну, зусім кароценькую, бадай што — карацельку.

Сполашнай маланкай прамільгнулі гады барацьбы з п’янствам, захаплення бегам, аэробікай... Карацелька, як кажуць, біла ў званы. Ды ўсё — адным махам па семярых.

Рэдактар уважліва прачытаў, прыцмокнуў і сказаў:

— Добра, якраз на тэму дня... Можа, толькі прозвішча «герою» дайце больш красамоўнае. Будзько... Гм, гм... Трэба нешта лёгкае, эфемернае. Во — Ластаўкін!.. І вынік яго, спартыўны, па-мойму, не зашкодзіла б удакладніць. Ці не занадта завышаны? Троху скасуйце. А то, ведаеце, могуць нас тут усіх абвінаваціць у недастатковай брацьбе з п’янствам.

— А калі гэтак вось? — Васіль Ступка з ходу выгукнуў новы тэскст: «Значных поспехаў дасягнуў т. Ластаўкін. Яго вынік першага месяца бегу трушком вакол свайго мікрараёна склаў... 18 рублёў 20 капеек за сабраную тару».

— Гм... Гэта ж колькі бутэлек чалавек знайшоў, каб атрымаць такія грошы?

— Дзевяноста адну.

— А бегаў кожны дзень?

— Так, кожны...

— Выходзіць — па тры бутэлькі ў дзень... Не мнагавата?

— Ну, не ўсе ж яны з-пад гарэлкі — п’юць і піва, і пепсі... Пустая бутэлька — дробязь, кідаюць там жа, дзе п’юць... Дзе прыйдзецца.

— Так, так, — пагадзіўся рэдактар. — Ваш герой сапраўды робіць добрую справу, нават і не адну: бегае — мацуе здароўе сваё, ачышчае ад хламу скверы й паркі нашы, але ж не толькі гэта — мае і прыбытак такі-сякі.

— Ваша праўда, так яно і ёсць.

— Добра... Пры першай магчымасці — надрукуем. Рэдакцыйны партфель распух ад матэрыялаў. Нахай троху абля́жацца, пахудзее.

Васіль Ступка яшчэ пільней стаў чытаць газету, але і тыдзень прайшоў, і другі на сконе, а на яго «карацельку» яўна забыліся. І ён зноў наведаўся да рэдактара:

— Ну, як там?.. Чаго марудзіце — я зачакаўся.

— А мой жа вы харошы... Якраз я такі й хацеў вас бачыць. Тут, ведаеце, замінка сталася — цэны на тару падскочылі, трэба нам лічбу змяніць, бо ўжо адна бутэлька каштуе 50 капеек... Значыцца — гэта колькі будзе?

— 45 рублёў 50 капеек, — умомант падлічыў новаспечаны карэспандэнт.

— Мусіць, столькі й будзе, веру... Што ж, як толькі ўправімся з сенакосам, разбярэмся з гаруча-змазачнымі матэрыяламі ды транспартнымі сродкамі — вось тады й пасмяемся. А пакуль — не да смеху.

Праз месяц рэдактар патэлефанаваў сам:

— Васіль Пятровіч, мы тут з вашага дазволу мусім лічбу змяніць... Ну, так, канешне. Бутэлька каштуе сёння ўжо адзін рубель... Але, гэтак — 91

рубель. Што-што? Калі надрукуем?.. Ды тут стае клопату — прадыху няма... Газета, ведаеце, не гумавая, месца для вашага матэрыялу ніяк не вымеркую, шмат допісаў злабадзённых... На першым месцы — праблемы раёна, ведаеце... Не, я вам не адмаўляю — абавязкова надрукуем... Будзьце здаровы!

Васіль Ступка гаротна ўздыхнуў і паклаў трубку.

Пралящела яшчэ колькі тыдняў. Неяк пад настрой Ступка зноў наведаў «раёнку», ветліва павітаўся з рэдактарам, набраўся духу і выдаў на гара́ чарговую карацельку, гэты раз паэтычную:

— У які нумар дасце мой гумар?!.

Рэдактара ажно падкінула ў крэсле — перад ім, бач ты, стаіць як і не Васіль Ступка, а няйнакш сам Кандрат Крапіва!

— Я прыйшоў выправіць лічбу. — Ступка, набычаны, падступіўся да стала, трымаючы ў руках паперчыну. — Во, усё перапісаў на́чыста... Бутэлька цяпер каштуе пяць рублёў! Чуеце? Пяць... А гэта ўжо добрая сума — 455 рэ.

— Гм... Я, ведаеце, чалавек не зайздрослівы, але скажу вось што: ніштаваты заробак мае гэты ваш Ластаўкін, — на поўным сур'ёзе сказаў рэдактар. — Усё-ткі бегам карысна займацца. Ва ўсіх сэнсах.

І гэты раз Васіль Ступка мусіў задаволіцца размовай. А між тым — час ляцеў на павышанай хуткасці. Праз месяц аўтар «карацелькі» пазваніў рэдактару, каб удакладніць чарговы вынік раённага «аматара» фізкультуры.

— Алё!.. Так-так, выпраўляю, — гучаў у трубцы ўзнёслы голас рэдактара. — Вынік Ластаўкіна — 1820 рублёў!

Праз два тыдні герой допісу Васіля Ступкі дамогся новага рэкорду — яго вынік склаў ажно 2275 рублёў.

Маленькая гумарэска тым часам станавілася ўсё больш каштоўнай і становячы прывабнейшай. І вось, калі агульная сума кошту ўсёй шклатары, сабранай шматпакутным Ластаўкіным пераскочыла за трыццаць тысяч (вядома, з улікам інфляцыі), Васіль Ступка звярнуўся да рэдактара з рашучай просьбай:

— Трэба лавіць момант — якраз цяпер вось самы час прыахвоціць людзей да заняткаў бегам. Бачыце, якая гэта выгода! Кожны прачытае, падлічыць — і пабяжыць!

— Даражэнькі вы наш, — рэдактар спачувальна развёў рукі ўбакі, — гэтая ваша тэма страціла актуальнасць. Паверце мне, я маю вопыт... Ну дзе вы сёння бачылі хоць адну пустую бутэльку? Гэта ж — жывыя грошы. А хто кідае грошы на сметнік?



# ЮБІЛЕЙ

Пра юбілеі многа сказана і не менш напісана. Нават у вершах. Гэта, канешне, свята, радасць, натхненне, чаканне, падвядзенне вынікаў і... грошы. Грошы, якія дораць (бывае, у форме падарункаў), і не меншыя грошы, якія ідуць на частункі, вечарыны, кветкі...

Але юбілеі бываюць розныя. Нездарма пра найбольш прывабныя і маладзейшыя нават прымаўкі склалі: скажам, калі ў цябе ў дваццацігадовы юбілей няма сілы, то не чакай — яе і надалей не будзе. Калі ў трыццаць розуму няма, дык і ў сорак яго не прыбудзе. А калі ў сорак на цябе не зваляцца грошы, то ўжо і ў больш сталым веку яны табе не свецяць. Тое ж самае і са славай — не прыйшла пасля пяцідзесяці гадоў, не прыйдзе і ў святыя ніколі.

Мусіць усё гэта сапраўды так. Але Матрона Пракопаўна пра такія прамудрасці нічога не ведала, бо жыла ў невялічкай вёсцы, расціла-выхоўвала дзетак, потым — унукаў, працавала ў калгасе ўсё жыццё і жыла выключна сваімі хатнімі турботамі й справамі, а пра такія паняцці як розум ды слава, ёй і думаць не было калі.

А ўсё ж такі чарговы юбілей Матроны Пракопаўны, прызнацца, быў незвычайны — ёй споўнілася сто гадоў!

Ну так, сто гадоў — гэта сто гадоў, цэлы век. Не, Матрона Пракопаўна на печы не сядзіць статуем у чаканні апошняга дня. Яна — рухавая, добра чуе

і бачыць, нават усё яшчэ і з гаспадаркай, праўда, не вялікай, але сама ўходжваецца. Дачка — у райцэнтры атайбавалася, сын — у сталіцы асеў, абжыўся. А для яе свая хаціна, парсючок ды кураняткі, кот Мурык — даражэй за ўсё на свеце.

Мурык ціхенька гудзеў каля ног, кураняткі квокалі неўстаялымі яшчэ галасамі, парсючок пранізліва скуголіў, калі несла яму бульбу-тоўчанку з хлебнымі скарынкамі, з якімі ўжо ёй, бяззубай, не ўправіцца... А болей і не трэба нічога — гаспадарка жыла, і яна, гаспадыня, была не лішняя пры ёй.

Аднак жа сто гадоў — дата адметная, важкая. Прыехалі дзеці, Кацярына ды Ілля, унукі, праўнучка Анжэла. Запрасілі суседзяў. Кожны з іх ведаў, што за добрае слова ў адрас Матроны Пракопаўны атрымае колькі чарак гарэлкі й добра закусіць.

І праўда, стол ламіўся ад спіртнога і закусі. Гучалі тосты.

Першы гаварыў Ілля:

— Няхай, мамка, у цябе ўсё будзе добра!.. Здароўя табе, настрою, каб заўсёды бадзёрая была і вясёлая...

Кацярына:

— Каб вырасціла ты, мамуся, яшчэ і прапраўнукаў!.. Каб усяго ў цябе хапала, каб гора не знала!..

— Можа, пенсію дабавяць, — зазначыў унук Ігар. — Ты ж, бабуля, аж два стажы выпрацавала — гадоў недзе семдзесят у калгасе гарбаціла.

— На дабаўкі спадзявацца не трэба, — запярэчыў Ілля. — У нас не дабавяць, а хутчэй адбяруць гэтую... У нас на простага чалавека не звяртаюць увагі — жыве ён сам па сабе... Мамка, мы цябе ў крыўду не дамо, абаронім!

Трэба ж, Ілля, як у ваду глядзеў. Адшумеў юбілей, мінуў месяц. Але ў звычны дзень, калі ёй паштарка прыносіла пенсію, ніхто да яе не завітаў. «Што ў іх там здарылася? — клопатна разважала старая. — Усе мае суседзі, нават маладзейшыя, атрымалі... Чаму ж мяне прамінулі?»

Праз месяц недзе ўсё ж мусіла наведацца на пошту — упрасіла суседавага хлопца, і той падкінуў яе на сваёй машыне на цэнтральную сядзібу калгаса.

За бар'ерчыкам у аддзяленні сувязі маладзенькая дзяўчына была ўважлівая і добразычлівая. Спагадліва пазіраючы на старую, запэўніла:

— Не хвалюйцеся, зараз мы ўсё высветлім... Мы ўжо, бачыце, каторы месяц працуем на камп'ютэрах... Усе пенсіянеры на строгім уліку, вашы грошы падлічаны й ніякай блытаніны адбыцца не можа. У нас усё ёсць, як у Грэцыі.

Але блакітны экран камп'ютэра быў надзіва бязлітасны й не такі ветлівы, як сінявокая гаспадыня яго. На жаль, прозвішча Матроны Пракопаўны ў спісе пенсіянераў не значылася.

— Як?.. Чаму?.. Куды я раптам знікла?!. Мусіць, нейкі землятрус у вашай Грэцыі?.. — дзівілася старая. — Вось жа — пашпарт мой, пабачце.

Дзяўчына ўвішна разгарнула пашпарт, зверыла з дадзенымі, што меліся ў камп'ютэры, спытала:

— Матрона Пракопаўна, вам сёння колькі гадоў?.. Толькі дакладна.

— Ну, сто.

— Сто?

— А калі дакладна — сто гадоў і дваццаць сем дзён.

— Ну так, так, — узрадавалася дзяўчына. — Знайшла я вас, знайшла!.. Ведаеце, камп'ютэр запраграмаваны толькі на сто гадоў, і вас, стогадовай, ужо няма на ўліку.

— Або-о, як жа мне быць? — затурбавалася старая. — Але вы, кажаце, знайшлі мяне.

— Ну, у камп'ютэры вы ёсць, — прачытала: — Матрона Пракопаўна Сіўчык... Якой усяго толькі дваццаць сем дзён ад роду. Вы — нованароджаная. І пенсіі вам цяпер — вой, вой! — прыйдзецца доўга чакаць.



## БЕНЕФІС

У тэатры рыхтаваўся бенефіс. Не, зусім не з дня нараджэння самага сталага, самага спрактыкаванага акцёра Апалінарыя Іпалітавіча Кукарэкі, а з прычыны яго шасцідзесяцігадовай працоўнай, а дакладней — творчай дзейнасці.

Апалінарый Іпалітавіч быў ужо нават тым адметны, што працаваў увесь час у адным тэатры, праўда, з рознымі рэжысёрамі. Акцёры й акцёркі прыходзілі й сыходзілі — нехта з'язджаў за мяжу, кагосьці пераманьвалі ў іншыя тэатры, а дыпламаваныя дзяўчаткі — тыя былі яшчэ спрытнейшыя: знаходзілі сабе старых, але даволі знакамітых рэжысёраў і квітнелі пад іх увагай, і творча раслі побач з імі.

Апалінарый Іпалітавіч быў і заставаўся верны й адданы адно свайму тэатру. Ніхто яго не пераманьваў і не прапаноўваў нічога лепшага. Сюды, у гэты горад, ён трапіў пасля тэатральнага вучылішча, тут ажаніўся, гадаваў дзетак і, бач, стварыў шэраг сцэнічных вобразаў.

Бенефіс рыхтавалі доўга і грунтоўна, бо дата значная. Трэба было падабраць спектакль з удзелам самога бенефіцыянта, прытым — спектакль цікавы, дзе акцёр праявіў сябе найлепшым чынам, што, безумоўна, будзе мець прамое ўздзеянне на так званую касавасць: то бок бенефіс без поўнай залы гледачоў — не бенефіс. Тады й банкет — не банкет.

Як і заўсёды, юбіляр мусіў сам запрашаць гасцей — лепшых сяброў, родных. Даўні сусед Апалінарыя Іпалітавіча, слесар Іван Адамавіч, у тэатры быў недзе гадоў пятнаццаць таму, але не запрасіць яго было б зусім недаравальна. Тым больш — на банкет. Юбіляр зайшоў да суседа, павіталіся па-сяброўску.

— Прашу цябе, Іван, прыходзь да мяне ў тэатр... 27-га, у гэтую суботу. Будзе бенефіс.

— Хто будзе? — перапытаў сусед.

— Бе-не-фіс.

— А хто ён такі, гэты Беня Фіс?.. Можа, нейкі шпіён, га? Ніколі пра яго не чуў. Ты мне прасцей растлумач, што ён за шышка на роўным месцы, каб перад ім так выстрэнчвацца?!.

— Ды не шпіён... Цемната!.. Бенефіс — гэта ў мой гонар спектакль, з банкетам. Зразумеў?

— Во, цяпер зразумеў... Так бы й казаў, што спектакль з выпіўкай. Прыйду, — пагадзіўся сусед.

З роднымі й сябрамі было прасцей — Кукарэка перадаў кожнаму запрашальныя білеты з поўнай праграмай вечара.

27 лютага, нягледзячы на прыкрае надвор'е, снег і галалёд, зала была запоўненая амаль на палову. Бенефіцыянт напаўразлёгся ў крэсле, што было абстаўлена кашамі з кветкамі, а побач з ім сядзеў перад мікрафонам вядучы, заслужаны артыст Хведар Залуцкі, які меў гучны й прыгожы барытон. Залуцкі па чарзе, строга па сцэнарыі, запрашаў на сцэну выступаючых.

Першым, канешне, выйшаў дырэктар тэатра Уладзімір Сой.

— Дарагі Апалінарый Іпалітавіч, віншую вас са святам! Працуем мы разам недзе каля дваццаці

гадоў. Гэта нямала. І я за вамі — як за каменнай сцяной. Мне лёгка з вамі. Я спакойны за вас. Сябры! За ўсе гады працы ў тэатры наш бенефіцыянт — гэта амаль фантастычна! — не меў аніводнай вымовы ці спагнання, затое ў яго працоўнай кніжцы запісана аж за дванаццаць падзяк. Дзесяць атрымаў яшчэ пры Савецкай уладзе за дапамогу падшэфнаму калгасу: капаў бульбу, будаваў цялятнік, касіў канюшыну. Наш Апалінарый Іпалітавіч — майстар на ўсе рукі! За апошнія гады ён атрымаў дзве падзякі за гераічныя ўчынкі, якія, можна сказаць, праявіў падчас спектакляў. Падзякі — за вырατаванне спектакля і гонару тэатра ў экстрэмальных сітуацыях. Акцёры добра помняць тыя моманты. Першы, калі акцёр Завальнюк (цяпер ужо былы) пасля заканчэння сваёй мізансцэны заблытаўся на сцэне і не мог трапіць у патрэбную кулісу — нараві́ў скочыць у праём аркестровай ямы; магчыма і скочыў бы, але наш дарагі Апалінарый Іпалітавіч пад заахвочвальныя апладысменты гледачоў, я сказаў бы, не вывеў, а вынес яго са сцэны на руках. Некаторыя гледачы былі настолькі ўзрушаныя, настолькі зацікаўленыя новым прачытаннем п’есы вядомага драматурга, што выказвалі падзяку не толькі рэжысёру, але і акцёрам — у першую чаргу Завальнюку. Другім разам любы ўсім нам спадар Кукарэка змог неўпрыкмет раскатурхаць і нават падказаць пачатак маналога акцёру Падаляку (таксама былому), які так моцна прытаміўся, смакуючы напоі з бутафорскіх пляшак, што забыў, дзе знаходзіцца.

Выйшла на сцэну галоўны касцюмер Вольга Паплеўка.

— Дарагі Апалінарый Іпалітавіч! — голас яе сіпаваты, пракураны. — Вы ведаеце, як мы ўсе, касцюмеры, вас любім і паважаем. Паважаем і любім. Каб усе акцёры былі такія, як вы, шаноўны наш Апалінарый Іпалітавіч, нам бы й гора не было горам, не сорамна было б працаваць за такія грошы. А колькі касцюмаў мы шыем: на кожны новы спектакль — новыя! Кожнаму акцёру! Ды з рознымі прыбамбасамі-выкрутасамі. Прабачце, не хачу нікога пакрыўдзіць, але, скажам, нашай рыме за адзін год памянялі ажно пяць сукенак, ды якіх! А бывае, што на адну п’есу трэба пашыць некаму з акцёраў ажно тры-чатыры living рознага крою касцюмы... З вамі, Апалінарый Іпалітавіч, на гэты конт няма праблем. Памятаю, апошні касцюм я сшыла для вас гадоў, мусіць, дваццаць таму. Проста ранейшы цесны вам стаў, давялося замяніць... Але той ваш, ранейшы, даношвае акцёр Чуносаў. Бачыце, вы, Апалінарый Іпалітавіч, умееце не толькі людзей паважаць і цаніць, але і рэчы... Дзякуй вам за гэта, любы наш чалавек!

Наступнай папрасіла слова грымёр Зінаіда Кулябякіна. Яна хвалявалася:

— Я таксама далучаюся да выступаючых... І вам асабіста хачу сказаць, Апалінарый Іпалітавіч, шчырае дзякуй за вашу сціпласць, ненадакучлівасць. Грым — рэч складаная, над некаторым цельпуком так пацееш, столькі часу прастаіш, каб стварыць новы вобраз, што проста жах! А з вамі ж — адна любата! Нават з заплюшчанымі вачыма ўсё зраблю за пяць хвілін, бо ведаю кожную рысачку вашага твару...

Хведар Залуцкі ціхенька пракашляўся — даў зразумець, што чарга выступоўцаў яшчэ не скончылася,

таму каб не парушалі рэгламент, выступалі коратка. Ён запрасіў на сцэну народную артыстку Станіславу Басараву, і тая адразу ж увайшла ў ролю прафсаюзнага дзеяча тэатра:

— Ад сябе і ад усяго калектыву мы шчыра віншуем нашага незаменнага Апалінарыя Іпалітавіча з творчым юбілеем! Вы для нас — бацька родны! Працаваць з вамі не толькі лёгка, але і проста. Вы ніколі не блытаеце мізансцэнаў, не забываеце тэксту, а для маладых акцёраў — вы яшчэ і цудоўны настаўнік. Апошнім часам наш тэатр прагна імкнецца да натуральнасці — гэта, каб на сцэне было менш бутафорыі, каб усё адпавядала рэчаіснасці, сапраўднаму жыццю. У нас тут пабылі ўжо і жывы конь, і сабака, не кажучы пра папугаяў ды кошак. Усё, што знаходзіцца на сцэне, павінна кранаць гледача, надаваць эфект прысутнасці. Ніякіх папяровых ці гліняных рэчаў, асабліва на стале... Вось я і кажу: Апалінарый Іпалітавіч для нас — і калега, і брат, і сват, і, як кажуць, воінскі начальнік. Цяпер нялёгкая ў нас, акцёраў, жытка. Калі нават нам, народным, цяжка, дык нашай моладзі — яшчэ цяжэй. Заробак у акцёраў мізэрны, а маладым — трэба сіла, моц. Так, менавіта ў моцным целе і дух моцны. І каму, як не нам, старэйшым, паклапаціцца аб тым, каб на сцэнічным стале было ўсё натуральнае? І першым такі клопат праявіў ён, шаноўны Апалінарый Іпалітавіч, і мы ўсе яму за гэта ўдзячныя. Яго мізансцэны заўсёды праходзяць узнёсла і на дастатковым узроўні, па-майстэрску. Яго выхаду ўсе мы чакалі, як манны нябеснай.

Пасля пранікнёнага выступлення галоўнага рэжысёра Анатоля Нікадзімавіча Кудзелкі, увесь

калектыў тэатра прыступіў да паказу апошняй дзеі спектакля па вядомай п’есе І. Тургенева «Нахлебнік», дзе адну з галоўных роляў выконваў акцёр Кукарэка...

Бенефіцыянт Апалінарый Іпалітавіч завіхаўся ля стала. У бездакорна чорным сурдуце, лакіраваных чаравіках, з перакінутым цераз руку рушніком, ён раскладваў на стале сурвэткі, расстаўляў талеркі, наліваў у графіны й пляшкі настойку і гарэлку, выкладваў з вялізнай місы смажаныя кавалкі мяса, нарэшце высыпаў проста на абрус гару духмянай бульбы...

У гледачоў з першых радоў пацяклі слінкі, бо сапраўды на сцэне ўсё сведчыла аб тым, што тэатр нарэшце павярнуўся-такі тварам да жыцця.

І вось — з-за куліс, з квітнеючага сада, выйшлі госці, запрошаныя на вячэру, жвава абменьваючыся думкамі пра надвор’е. І тут — да радасці ўсіх — гучны й басавіты голас Апалінарыя Іпалітавіча выдаў сваю самую сакраментальна-жаданую і вядомую фразу:

— Прашу есці!



# КРОПЛІ ДАЦКАГА КАРАЛЯ

Хто не ведае, як цяжка ажаніць устаялага халасцяка. Асабліва, калі яму стукне сорак гадоў. Хаця, прыгадаем, за Польшчай з такім узроставым цэнзам жаніх быў самы сапраўдны, так сказаць, — кавалер надзейны, з грашыма. Стае такіх, польскіх кавалераў, і ў нашых краях, сёння. Прызнацца, унаравіць бываламу ды сталаму хлопцу здолее рэдка якая жанчына. Бадай у кожнай з іх яму бачацца заганы: то рост не той, то з дзіцем ужо, то смяецца непрыгожа... Пералічваць можна бясконца.

Менавіта такім быў і Генадзь Млявы. Жыў у інтэрнаце, працаваў на будоўлі майстрам. Значных недахопаў — такіх, каб адразу даваліся ў вочы, не меў. Як, зрэшты, і вартасцяў. Аднак жа знайсці сабе жонку па свайму густу ён усё яшчэ так і не знайшоў. Хто ведае, чаму чалавеку не шанцуе: ці ў яго густ нейкі дапатопны, ці сам не без заганаў.

Многія з тых хлопцаў, хто жыў з ім побач, ужо даўно знайшлі сабе дзяўчат з кватэрамі, машынамі й дачамі. Толькі Генадзю не шанцавала. Нават не тое, каб не шанцавала, — проста ён сам не праяўляў велькай ініцыятывы, саромеўся, і, як сцвярджаў малады інжынер Ігар Мугака, якога міжсобі ўсе называлі Казановай з-за нястрымнага тэмпераменту, не выдзяляў прыцягальных для жанчын флюідаў.

Генадзю спачувалі, яго павучалі, давалі чытаць нават спецыяльную — эратычную — літаратуру, але нечага раптам на фінішнай прамой, калі, здавалася,

усе падыходы да сэрца жанчыны, як і да іншых яе таямніц, былі знойдзеныя, усё зрывалася і ляцела ў бездань.

Рыгор Залівака — малады тынкоўшчык, хлопец жвавы й вясёлы, не раз казаў:

— Ты больш настойлівей завіхайся каля іх... Больш нахабнасці, яны гэта любяць. Толькі так і возьмеш каторую.

— А калі яна сарамлівая, з гонарам?.. Не-е, нахабствам адно спужаеш, — роздумна заключаў Генадзь Млявы.

— Не ведаю, не ведаю... Я такіх не сустракаў. Смеласць гарады бярэ. Жанчыны любяць вушамі. Ты ёй навешай на вушкі абяцанкаў-цацанкаў — і яна твая. Праверана практыкай.

— Я гэтак не ўмею... Ты ж ведаеш, з жанчынамі я губляюся, мову адымае... Дый рукам не прывык даваць волю, — як мог адхрышчваўся Млявы.

І вось — самыя найлепшыя яго сябры ўзялі ініцыятыву ў свае рукі. Накуплялі газет з аб'явамі знаёмстваў і давай вышукваць належную кандыдатуру. Адразу ж адхілілі тых адрасатак, чые тэлефоны сведчылі аб аддаленасці іх кватэр ад цэнтра горада — такім патрэбныя мужчыны без матэрыяльных праблем. Потым збавіліся і ад тых, чый узрост, габарыты ды ўсялякія іншыя жаночыя тонкасці не адпавядалі густу Генадзя.

— Эўрыка!.. — амаль галасіў Алег Скавыш. — Знайшоў-такі. Усё, што трэба і ўсяму адпавядае: узрост — 25 гадкоў, Дзева па гараскопу, не замужняя і не была замужам, мае кватэру, машыну, а галоўнае — з вышэйшай адукацыяй краля.

— Нешта ж такая багатая ды разумная — і адна?.. — засумняваўся кавалер.

— Іменна такія вось і адны... Мы ж іх баімся, шукаем прасцейшых, — пасміхнуўся. — Безадказных шукаем і шлюбуемся. А гэтыя, з адукацыяй, машынамі-дачамі, кукуюць у адзіноце. Не так хіба?.. Тыя ў газету не пішуць, у каго ад кавалераў адбою няма.

— Можа, і так, — пагадзіўся кандыдат у мужы. — Але ж я і сам такіх пабойваюся... Каб не спатыкнуцца на дужа разумнай, га?

— Хопіць, не адпірайся, — і Казанова пляснуў у далоні, загадаў: — Тэлефануй!

Але датэлефанавацца не так і проста было. Увесь час з трубкі несліся кароткія гудкі, што магло азначаць толькі адно: у пошуках нявесты спадар Млявы быў не адзін. Страціўшы надзею дазваніцца, недзе праз тыдзень ажно Генадзь нарэшце пачуў у трубцы пяшчотны жаночы голас:

— Я слухаю вас...

— Інэса, я — па аб'яве... Генадзь Млявы... Вы мне, здаецца, падыходзіце. Хацеў бы... Мгм, сустрэцца з вамі.

— Без праблем, — адказала Інэса. — Хвілінку, пагляджу свой расклад... Так, у мяне свабодная пятніца. У 20.00 падыдзе?

— Доўга чакаць, — расчаравана выціснуў з сябе Млявы. І даволі рашуча прапанаваў: — Заўтра ў 10.00, раніцай, ля Паштамта пад гадзіннікам.

— Ой — не-не! Не магу... Няма аніводнай хвіліны вольнай — праца, потым розныя мерапрыемствы... Чуеце, Генадзь?

— Ага, слухаю вас, Інэса, чую.

— Толькі пятніца, 17-га.

— Ажно пяць дзён?!.

— Нічога, — лагодна суцешыла будучая нявес-

та. — Затое прыемнай будзе сустрэча. Дык вось: чакаю ля цырка ў дваццаць гадзін роўна. Буду ў пясцовым паўшубку, на каўняры — блакітны шалік... Да сустрэчы!

Так, яна паклала трубку, аб чым сведчылі кароткія гудкі. Гэткія паводзіны Інэсы не расчаравалі Млявага і яго сяброў, а хутчэй наадварот — паддалі ахвоты й кемлівасці. Пачалі хлопцы рыхтавацца да сустрэчы як мае быць.

— Па-першае, вопратка!.. — ажывіўся Зміцер Гамза. — Ну так, па адзёжцы сустракаюць. Бачыш, яна прыйдзе ў пясцах... Гэта, лічы, папярэджанне: беднага хіляка тут жа адпрэчыць. Гм, а ты ў сваіх, ёлкі-палкі, дапатопным палітончыку ды трусінай шапцы перад яе паўшубкам зліняеш, бы рак пасля кіпетню... Табе трэба модная кароткая паўдублёнка, кепі, чаравікі на рыфлёнай падошве!

— Дзе я ўсё гэта вазьму?.. — разгубіўся Генадзь. — У мяне, хлопцы, няма грошай на такія пакупкі.

— Не хвалюйся, дружа, — супакоіў Зміцер сябрука. — У нашым інтэрнаце, калі хочаш ведаць, моднай вопраткі нават больш, чым у тых Ждановічах... Пазычым, а не — возьмем напракат. Танна, бо на адзін вечар.

І сапраўды, з вопраткай-адзеннем усё было хутка вырашана. Узяліся «разварочваць» сцэнарый сустрэчы. Тут ужо «руліў» Казанова:

— Я, уласна, вось пра што... Вопратка — вопраткай. А вось гутарку, думаю, трэба запланаваць недзе ў рэстаране. Пасядзяць, дамовяцца. І што далей?.. А далей, калі наш Генік не будзе лавіць варон, мусіць адбыцца інтым... Класічны варыянт, га?

— Як — адразу ў ложак?.. — затурбаваўся будучы муж.

— А чаго, уласна, цягнуць? — Казанова прыжмурыў вока і ўражліва паглядзеў на сябра. — Няўжо, думаеш, яна проста так прызначыла сустрэчу на пятніцу і блізка ад дому?.. Не-е, дзеўчынёха не дурніца, ёй важна выведаць усе твае здатнасці. Усе да астатку!.. Пабачыш, як толькі ты ёй прапануеш пасядзець за філіжанкай кавы ў «Бярозцы», яна запросіць цябе дадому, бо ў яе і кава лепшая, не пойла, і да кавы нешта знойдзецца... Улічы, Генік, бацькі на дачы — і вы адны, інтым, га?.. Адказны момант, ты на ўзроўні павінен быць, зразумеў?

— Не ведаю, хлопцы... З маім вопытам наўрад ці можа атрымацца «на ўзроўні» — не здолею, — пацiснуў плячыма.

— Вопыту набярэшся... Пачытаеш «Камасутру» — кніга з малюнкамі, усё там знойдзеш, адно запамінай. Дам колькі касетаў з парнухай... А далей — галоўнае, каб твая «жанілка» не падвяла.

— Чорт ногі паломіць... Нічога ў мяне з ёй у першы вечар не атрымаецца. Пакуль не пакахаю — нічога...

— Ты толькі не замінай — сама выведзе на фінішную прамую, — Казанова проста гарэў справаю. — А каб атрымалася — сядзеш на гэтыя дні на дыету з афрадызмамі.

— З якімі яшчэ афрадызмамі? — збянтэжыўся Генадзь. — Як сяду?

— Ну, у сэнсе — будзеш есці... Такімі, што павышаюць сексуальнасць... Лепш слухай сюды й запісвай, — разышоўся Казанова. — У цыбулю чырвоную дабаў яек курыных, потым — траву

гарчыцы... І ўжывай цалебу гэтую тры разы на дзень. Каб смачней было — з мёдам. Цыбулю можна патушыць, яйкі адварыць.

— І ўсяго толькі? — здзівіўся Генадзь.

— Пазней, калі штурм адбудзецца, я раю ўжываць кожны дзень рыбу, піць чырвонае віно перад сном... Гэта пасля, каб «жанілка» не здавала.

— Чырвонае віно люблю...

— І яшчэ... Еш кожны дзень сельдэрэй. І чым больш, тым лепш.

— Сельдэрэй?..

— Бачу, цемра ты непрасветная. Старажытныя лекары так казалі: «Калі б мужчыны ведалі пра моц сельдэрэя, яны засеялі б ім усю зямлю». Э-э, што яшчэ? — на хвілю задумаўся Казанова. — О!.. Жэнь-шэнь можна прымаць, элеутэракок, папскі соус...

— А на кроплі Дацкага караля забыў?.. — уклініўся ў размову Зміцер, які трымаў у руках прыгожа аформлены фаліянт — тую самую «Камасутру», з якой мусіць пазнаёміцца Генадзь Млявы. — Памятаеце, Акуджава спяваў: «Кроплі Дацкага караля піце, кавалеры...».

— Можа, яшчэ і Крамлёўскую пігулку параіш? — выстарчыў вочы Казанова. — Дзе ж іх узяць, тыя кроплі?

— Купіць... Абы грошы. Заўтра ж будуць і кроплі й пігулі.

У прызначаны час, апрануты з іголачкі, падрыхтаваны «Камасутрай» і «відзікамі», нашпігаваны цыбуляй з яйкамі, сельдэрэем, упоены кроплямі Дацкага караля, Генадзь Млявы, атрымаўшы апошнія наказы й парады сяброў, рашуча папраставаў праспектам у бок цырка.

Услед яму пачулася:

— Жадаем табе, як лётчыку, належнай вышыні!

Ён азірнуўся і кінуў у адказ:

— К чорту, Казанова!.. — І дадаў: — Чакайце ў інтэрнаце!

І яго чакалі. Адсутнічаў недзе пяць гадзін. І толькі сярод ночы жаніх ціхенька адчыніў дзверы... Але ніхто не спаў — усе, як па камандзе, паўскоквалі з ложкаў, абступілі хлопца.

— Ну, як?.. Гавары, — Казанова ўхапіў Генадзя за адварот дублёнкі. — О'кэй?!. Толькі не цямні — усё выкладвай, як было.

— На ўсё не замахвайся... — Твар Генадзя Млявага, аздоблены шчаслівай усмешкай, гарэў макавым цветам, а вочы... вочы яго былі ўсё яшчэ недзе там, у яго новым шчасці няйнакш. — Супакойцеся, усё было на вышэйшым узроўні, — выдыхнуў ён.

— Маеш на ўвазе інтым? — Казанова адступіўся ўбок, аціх у чаканні адказу.

— Канешне... Я атрымаў такую асалоду, такую... Як ніколі ў жыцці. І ўсё — дзякуючы вам, мае вы дабрадзеі. І асабліва — кроплям Дацкага караля... Дапамаглі... Вельмі.

— А яна... Як Інэса?

— Не ведаю... Хм, яна не прыйшла.

# КНІГАЛЮБЫ

Па-рознаму любяць кнігі. Нехта іх заўзята чытае, не зважаючы на знешні выгляд, вокладку. Глынае старонку за старонкай. Бярэ ў бібліятэцы, у знаёмых, зрэдку, калі завядуцца грошы, купляе. Але ёсць асаблівая катэгорыя кнігалюбаў, тых, хто кнігі збірае, калекцыяніруе, пераважна з-за іх незвычайнага знешняга выгляду ды гучных назваў. Стае тут і бульварнага чытва, ярка размаляванага, у каляна-бліскучых вокладках, з кідка-голымі красунямі, вампірамі-гвалтаўнікамі з ашчэранымі пашчамі, з пісталетамі ў руках...

Маладыя муж і жонка Качкарыкі, Алена і Косцік, жылі не вельмі прыкметна, з суседзямі мала ведаліся, соль ці запалкі, як гэта звычайна бывае, паміж добрымі суседзямі, не пазычалі, не сварыліся, дый у сваю кватэру нікога ніколі не запрашалі. Адным словам, жылі не па-людску. Але ўсе ў доме, асабліва дасціпныя бабулі, якія цэлымі днямі не сыходзілі з лаўкі, што каля пад'езду, ведалі: ёсць у гэтай маладой сям'і захапленне — кнігі. І ён, і яна як не штодня неслі з сабой фантастыку і мемуары, сусветныя бетселеры й дэтэктывы. Кнігі яны збіралі апантана.

Часам суседка, жанчына вельмі ахвочая да чытання, прасіла ў Алены што-небудзь цікавенькае, бо ўсе свае кнігі перачытала двойчы. Ды Алена, як заўсёды, разгублена адказвала:

— Не я кнігі збіраю — Косцік, і ён іх у шафы па-свойму парадкуе, каталог вядзе, і мне забараняе перастаўляць... Так што — выбачайце. Вазьміце лепей у бібліятэцы.

— А самі вы хоць чытаеце свае кнігі? — пацікавілася суседка. — Цяпер шмат розных аматараў: хто маркі збірае, хто бутэлькі ад імпартных напояў, а хто — запалкі...

— Не, мы кнігі любім, — з гонарам адказала Алена. — Не расстаемся з імі.

І празвалі маладых людзей з трынаццатай кватэры кнігалюбамі. Дзе працавалі — ніхто не ведаў. Але здагадваліся, што былі яны, як цяпер модна казаць, прадпрымальнікамі. Раней іх з абурэннем, абразліва называлі б спекулянтамі, дармаедамі, а сёння — іншы час, і нікому няма аніякай справы да таго, за якія такія грошы твой сусед есці хлеб, п'е гарэлку, ездзіць на іншамарцы. Вядома ж, хочаш жыць — умей круціцца. А тым больш — з такога дзіўнага хобі, як назапашванне кніг, навару не вельмі.

Аднойчы раніцай сусед кнігалюбаў, Васіль, выйшаў у калідор пакурыць. Ён быў непрыемна здзіўлены нейкімі незразумелымі адмецінамі й шчылінамі ў дзвярах Косціка і Алены. Нехта вельмі неасцярожна, каб не сказаць, жорстка папрацаваў тут дрэллю ці сякерай. Трэба ж, ніхто нічога не чуў і не бачыў. Не азваўся нават вельмі крыклівы й чуйны сабака з 12 кватэры. Але факт, як кажуць, быў у наяўнасці, а дакладней — на дзвярах. Праз вялікія шчыліны праглядваўся калідор кватэры кнігалюбаў.

Васіль умомант ацаніў сітуацыю — сабраў суседзяў, вылікалі міліцыю. Двое маладзенькіх

міліцыянтаў у прысутнасці панятых, тых жа суседзяў, адчынілі дзверы й пачалі агляд і перапіс рэчаў. Цікаўны Васіль упершыню бачыў таямнічае нутро суседняй кватэры. Асаблівых адкрыццяў не было — пісьмовы стол, канапа і некалькі крэслаў ды столік з тэлевізарам, астатняе — стэлажы з кнігамі. Назвы на пераплётах сведчылі аб align рознабаковым гусце гаспадароў.

На першы погляд — ніякага разбою ці крадзяжу не было, падалося, што і ўсе рэчы на месцы. Адно гаспадары адсутнічалі.

— Такім чынам, мы маем справу са спробай абрабавання, але яўна няўдалай, — падвёў вынік адзін з міліцыянтаў. — На шчасце!

— Толькі незразумела, — пацiснуў плячыма другі міліцыянт, — што злодзеі маглі шукаць у такой небагатай кватэры?.. Наўрад каб тут была якая відэатэхніка ці залатыя рэчы, а кнігі... Каго сёння могуць цікавіць кнігі? З-за іх кватэры не ўзламваюць.

Міліцыянты на дзверы навесілі пломбу, апячаталі, а суседзям сказалі, каб наглядалі за кватэрай, пакуль гаспадары не заявяцца, бо злодзеі могуць, калі што, і вярнуцца. Усяк бывае.

Праз дзень знайшліся гаспадары. Збянтэжаныя, разгубленыя, устрывожаныя, яны тут жа кінуліся да кніжных паліц.

— Кнігі... Мае кнігі!.. — лямантавала Алена.

— Мая фантастыка!.. — ледзь не плакаў Косцік.

Нават зусім абыякавы да кніг Васіль не вытрымаў, мусіў суцешыць устрывожаных суседзяў:

— Не хвалюйцеся, ніводнай жа кнігі, па-мойму, ніхто не крануў... Ваша багацце на месцы.

— Так, багацце, — са слязьмі на вачах уздыхнула Алена. — Мне кожная з гэтых маіх кніг даражэй за тэлевізар ці футра... Ой, я не пераժыла б, каб прапала хоць адна з іх!..

Калі ўсё супакоілася, Косцік з Аленай, зачынілі дзверы, зашторылі шчыльна вокны й старанна пачалі перабіраць кнігі.

— Жаклін С’юзан... Тут трыста даляраў. Ой, Косцік, нечапаныя. Дзяку Богу, на месцы.

— У пяцітомніку Агаты Крысці таксама ўсё о’кэй... Чуеш, Алена? Як і было — у кожным па пяцьсот.

— Косцік, правер у Брэдберы, а я Кінгам займуся... Фу, і тут усё на месцы.

— Праверыў, дарагая... Дзякуй Богу, што так мала кнігалюбаў на свеце.



# БОРМУДЫ

Ранняй восенню на свежапакладзеным асфальце раптам утварылася невялічкая трэшчынка. Вузенькая, ледзь прыкметная, быццам зморшчынка на твары какеткі. Зморшчынка не ад старасці, а ўсяго толькі ад смеху.

Трэшчынку на асфал ьце вецер і вільгаць пачалі пакрысе паглыбляць і пашыраць, і аднойчы мужчына, які праходзіў міма, кінуў у яе абгарэлую запалку, і тая роўненька, нібыта ў ложак, улеглася на дно канаўкі. Праз колькі дзён яшчэ колькі запалак трапіла ў трэшчынку, потым лёг побач парожні пачак з-пад цыгарэт.

Праз колькі часу трэшчынка пашырэла і ўжо нагадвала даволі ладную шчыліну, куды восенькі вецер змятаў дробныя паперкі й апалае лісце, іншае смецце.

Такая перашкода на тратуары чамусьці падабалася школьнікам, якія весела пераскоквалі праз яе, кідалі ў яе глыбокую зяпу абгорткі ад цукерак і чыпсаў. Праз нейкі час Ягор Мацюлка навечна затоўк туды свой дзённік з плоймай новаспечаных двоек, што на нейкі час і ўратавала яго ад бацькавай папругі.

Месяц мінуў, другі — і колішняя трэшчынка стала нагадваць даволі прыкметную яміну, напоўненую розным ламаччам, анучамі, скруткамі са смеццем і нават бітымі бутэлькамі. Неўзабаве на месцы яміны ўтварыўся пагорачак, які вырастаў,

прымаючы новыя контуры й памеры, проста на вачах у жыхароў суседніх дамоў. Пешаходы, лаячыся і пасылаючы праклёны неіснуючым ужо даўно дворнікам, абыходзілі злашчаснае ўзвышша па шашы, рызыкуючы патрапіць пад колы шалёных легкавушак.

Канешне, няўклюдны грудок смецця не ўпрыгожваў навакольны ландшафт, вельмі замінаў, але ўспрымаўся ўсімі як нейкая стыхійная з'ява, з якой ніхто не ведаў, як змагацца.

Узімку намяло снегу, грудок ўвачавідкі падрос, пашырыўся яшчэ больш, і дзятве падчас зімовых канікулаў тут было файна праводзіць час — каталіся з крутой горкі й на санках, і на фанерках... Смех, галас стаялі цалюткі дзень.

А вясною на гэтым узвышшы з'явілася і такая-сякая зяляніна. Тут сталі прызначаць сустрэчы закаханыя. І аднойчы цётка Марыля, якая жыве ў першым пад'ездзе ў першай кватэры, ад вокнаў якой — рукой падаць да гэтай пышна-зялёнай круглявіны, калі ёй верыць, нібыта аднойчы ўначы бачыла, як ён і яна, маладыя людзі, займаліся сэксам...

Вось жа — нечага раптам улетку ў гэтым раёне пачалі знікаць людзі. Першым не стала тутэйшага алкаша Барыса, якога за вочы, — а той-сёй і ў вочы — называлі Бора-мудак. Яго фіялетавы нос і сінія шчокі надта дапамагалі маладым мацяркам выхоўваць сваіх малявак: «Не будзеш есці — паклічу Бору», або: «Не з'ясі гэту моркаўку — будзе такі ж нос і ў цябе, як у Боры...»

Знік Барыс — стала цішэй і нават чысцей у пад'ездзе. Жонка ягоная, кабета кволая і панурая, якая часта вымушаная была насіць чорныя акуляры, неяк адразу знешне пахарашэла, а праз колькі дзён

забылася на акуляры, бо сонечнае святло перастала дрэнна ўздзейнічаць на вочы...

Неўзабаве не стала сантэхніка Максімыча, які ўжо недзе год таму як перайшоў на прыватную дзейнасць і браў за сваю працу выключна «вадкай валютай». Паколькі жыў ён адзінока, дык яго асабліва ніхто і не шукаў.

А ўжо калі як скрозь зямлю праваліўся адстаўны прапаршчык Вася, тут ужо сярод людзей папаўзлі трывожныя чуткі. Гаварылі пра жудаснага маньяка, які знішчае дарослых і досыць яшчэ спраўных мужчын-выпівох толькі таму, што не пераносіць і блізка паху спіртнога. Той-сёй не пагаджаўся і абвінавачваў НЛА — іншапланецяне, маўляў, забіраюць ужо непатрэбных грамадству зямлян да сябе і там вывучаюць іх гэтак жа сама, як у нас тут вывучаюць падвопытных жаб ці мышэй.

Затое дасціпная і ўсюдыісная цётка Марыля зноў здзівіла сваіх суседзяў тым, што голас Бормуда чула на свае ўласныя вушы, калі праходзіла позна ўвечары каля грудка на асфальце. Гаварыў ён глуха, быццам пад зямлёй, і язык дужа заплятаўся: «Налівайце, браточкі... Налівайце. Дай Божа, не апошняя...»

І літаральна праз дзень яна зноў даводзіла суседзям свой новы досвед: нібыта нейкія прывіды пры святле маладзіка соўгаліся паўзбоч грудка — збіралі, падобна, бычкі, якіх там багата накідана.

Новае геаграфічнае ўзвышша яшчэ не было пазначана на карце горада, але назоў ужо свой займела — Бормуды. Такое магло стацца з прычыны таго, што мясцовыя жыхары, уражаныя жахлівай славай вядомага трохкутніка, адкрылі ў сваім раёне

бадай што не менш жахлівы «трохкутнік», назваўшы яго гэтак у знак ушанавання ганебнай памяці Борымудака. Так і павялося: Бормуды й Бормуды...

— Не хадзіце позна каля Бормудаў, — папярэджвалі маці сваіх маладзенькіх дачок і дапытлівых падлеткаў.

У сувязі з павышанай крымінагеннасцю Бормудскага ўзвышша улады вымушаны былі арганізаваць там пастаяннае патруляванне міліцыі й АМАПА.

Праз год мясцовыя сродкі грамадзянскай абароны вельмі зручна выкарысталі Бормуды для вучэнняў з нагоды радыяцыйнай пагрозы.

І зусім нечакана для ўсіх аднойчы на версе велічнага ўзгорка з'явілася манументальная мемарыяльная дошка: «Помнік гісторыі й архітэктуры канца XX стагодзя. Ахоўваецца дзяржавай!»



# ТЭСТ НА СВЯДОМАСЦЬ

Будынак новенькай крамы «1000 дробязяў» зіхцеў, бы навагодняя зорка. Вядома — шкло і мармур! Але шматлікія пакупнікі неўзабаве сталі называць краму зусім інакш: «Акварыум». І не з-за наяўнасці там жывой рыбы, а з-за вялізных вокнаў, што пачыналіся ад зямлі і ўпіраліся проста ў дах. Сапраўды, крама на розныя дробязі багатая: цвікі й сшыткі, лямпачкі й касметыка, парасоны й мыла... Наогул, прасцей пералічыць, чаго там няма.

Уражанне ад крамы, калі на яе глядзець здалёк, велічнае. А калі запальвалася святло — і зусім фантастычнае. Вядома ж, такая будыніна патрабавала і адпаведнага наваколля. На чарговым пасяджэнні райвыканкама, дзе прысутнічала і адміністрацыя крамы, было вырашана насупраць прыгожага будынка, пад вокнамі, разбіць не менш прыгожы газон з кветкамі. Дзеля гэтага месца хапала.

— А як жа падыходы будзем рабіць, калі ўсё кветкамі засеем? — засумняваўся малады чалавек, інжынер-дарожнік. — Каб нешта купіць, трэба спачатку зайсці ў краму.

— Каму трэба, той абыдзе газон, — паспяшаўся з адказам начальнік азелянення. — У нас, наколькі мне вядома, паноў няма.

— І ўсё ж лепей хадзіць па гіпатэнузе, чым па катэтах, — стаяў на сваім дарожнік.

— Вас, паважаны, збіваюць з тропу звычайныя дробязі, — заўважыў старшыня райвыканкама. —

Думайце пра дызайн... І наогул — трэба мысліць глабальна, а не ў местачковым маштабе.

— А я чытала, што ў Францыі, здаўшы будаўнічы аб'ект у эксплуатацыю, наўкол яго раўняюць зямлю, пасыпаюць пясочкам — і людзі самі выбіраюць, дзе ім зручней хадзіць. — Сакратарка Насценька трымала ў руках часопіс «Навука і жыццё» і таму, пэўна, да яе інфармацыі ўсе паставіліся зацікаўлена. — Пасля пратаптаныя сцяжынкі асфальтуюць — і ўсё, няма праблемы.

— У нас тут, вядома, не Францыя, — дырэктар «1000 дробязяў» быў надзіва асцярожны ў выбары слоў, памяркоўны. — Нашы людзі да еўрапейскага сервісу непрывычныя... Могуць так натаптаць, што сам чорт нагу зламае. Дык вось — як зробім, так і будзе... Пойдуць, абы ў краме тавары былі.

Праз нейкі час кветкі ў шыкоўным газоне сталі зацвітаць. Але каб усе яны радавалі прахожых — не, гэтага сказаць нельга: зялёна-пярэсты лужок прарэзала вузенькая, нібы веласіпедны след, сцяжынка. Праз колькі дзён гэтая першая сцяжынка стала значна шырэйшая, а дзве новыя былі адно пазначаныя. Далей — болей: сцяжынкі множыліся з неверагоднай хуткасцю. Сэрца сціскалася ад такога нечаканага нахабства.

У райвыканкаме вырашылі агарадзіць лужок. Агароджу зрабілі нізенькую, дэкаратыўную, каб не псавала ландшафт. Не дапамагла агароджа — сцяжынкі працягвалі існаваць. Паставілі некалькі шыльдаў з лаканічным папярэджаннем: «Асцярожна — пасаджаны кветкі!»

Можа, з-за няўважлівасці, ці проста з-за будзённай мітусні ніхто на такую сціплую перасцярогу

не звяртаў увагі. Малы савет райвыканкама адрэагаваў імгненна — з'явіўся новы тэкст: «Хадзіць забаронена!» Калі й гэта не дапамагло, чырвонай фарбай зверху дамалявалі пагражальнае слова: «Строга!» Але ўсё — трын-трава: шыльды з катэгарычнымі надпісамі аніяк не ўздзейнічалі на жалезабетоннае сумленне грамадзян. Сцяжынкі пратоптваліся з яшчэ большым імпэтам.

— А давайце пачнем штрафаваць!.. Якраз будзе за што расаду купляць, — падказала намеснік дырэктара крамы «1000 дробязяў». — Напішам: «Хадзіць строга забаронена — штраф 100 рублёў».

— Ха-ха-ха!.. — залілася смехам сакратарка Насценька. — Сёння за такія грошы нават чвэртку марожанага не купіш!

Падняўся старшы таваравед і сказаў:

— Мы яўна нешта не ўлічваем... А давайце правядзем конкурс на лепшы заклік. Вось, напрыклад, калі вы не супраць, я прапаную вершаваную страшылку, сам сачыніў:

Тут хадзіць я вам не раю,
бо няшчадна пакараю!
Хто не верыць —
хай праверыць.

— Бязглуздзіца нейкая... — цепнула какетліва плечуком Насценька. — што тут правяраць?

Старшы таваравед пагрозліва калыхнуў густымі брывамі, счакаў, пакуль дзяўчо перастала смяяцца, стоена сказаў:

— Гэты мой вершык іх заінтрыгуе... Невядомасць заўсёды страшыць.

Прынялі прапанову таваравeда адзінагалосна. Паставілі шчыт, на якім чырвоным па беламу быў

каліграфічна напісаны вершык, аднак жадаючых «праверыць», хто ж ён такі таямнічы суддзя, аказалася не менш ранейшага.

І калі здавалася, што ўсе сродкі барацьбы з таптунамі газона вычарпаны, што ратунку ад іх ужо бадай што няма, аднойчы, глянуўшы ў акно, прадаўшчыца з аддзела канцтавараў Ірэна аж уздрыгнула ад здзіву, выгукнула:

— Нарэшце!.. Нарэшце свядомасць узяла сваё: пакупнікі не пруцца напралом — абыходзяць газон. Падзейнічалі нашы заклікі!

— Ірка, не чаўпі абы-што... Не крычы, — ахалодзіла пал прадаўшчыцы прыбіральшчыца цётка Зоя. — Там на ўсе вашы шыльды нейкі дзівак напрыколваў паперак з надпісам: «Праход для жывёлы!»



# САЛОН ДЛЯ ЦІКАВЫХ ЛЮДЗЕЙ

Пра тое, што яна адкрывае «салон», Валерыя Эдуардаўна расказвала ледзь не ўсяму гораду. Сябры й сяброўкі, вядома, першым чынам пыталі, якія дывідэнды ён прынясе, гэты яе салон, але Валерыя Эдуардаўна, або проста Лерачка (нягледзячы на ўзрост, — божухна, аж за сорак! — яна была вельмі рухавая, вясёлая, як кажуць, эмацыянальная) у адказ рагатала:

— Вялікія, і не толькі мне. Бо збіраемся мы не дзеля стравы матэрыяльнай, а перш за ўсё — духоўнай. Кожны, хто прыйдзе да мяне, вернецца дамоў з добрым настроем, з цікавай інфармацыяй... Адным словам, культурна абагаціцца. Я запрасіла самых знаных людзей горада, яны аб'ездзілі паўсвету... Чакаю, не спазняйцеся!

Усе былі заінтрыгаваныя, вечарына магла стацца выключна цікавай. Мастак-анімаліст, які сам пабываў адно ў Польшчы й Балгарыі, а гэта амаль што Беларусь, вельмі прыязна ўспрыняў сустрэчу з відавочцамі, прызнаўся, што будзе слухаць іх з захапленнем.

Сабраліся а сёмай гадзіне. Гаспадыня з густам накрыла журнальны столік: прыгатавала нейкую дзівосную салату ці то з адуванчыкаў, ці нават з канюшыны, паставіла лікёр — гэта ўжо быў унёсак кагосьці з гасцей.

Мастак-анімаліст незадаволена чмыхнуў з прычыны адсутнасці мяснога блюда:

— Пардон, у мяне ад сіласу ў жываце бурчыць... Лепей я папостую ля акна.

Валерыя Эдуардаўна з'едліва заўважыла:

— Мы жывем не для таго, каб есці, а ямо для таго, каб жыць. Прывучайцеся, шаноўны багамаз, да памяркоўнасці.

Гледзячы на яе вытанчаны станік, наўрад ці хто мог не ўсумніцца ў тым, што яна сама есці толькі калі-нікалі, адно каб не памерці з голаду.

І гэты раз — крышку замарылі чарвяка, пасмакавалі лікёру, бо стопачкі былі падобныя больш на капіляры, якімі бяруць кроў на аналіз. Нарэшце Валерыя Эдуардаўна прапанавала паслухаць цікавых людзей і першай падняла Кацярыну, якая дзён колькі таму як вярнулася з Кітая.

— Ну, давай, Каця, расказвай, якая яна там, краіна амаль узыходзячага сонца?.. Расказвай!

— Ой, ведаеце, — расчулена залыпала вачыма рыжая Кацярына, — сонца там сапраўды хапае, але яго на сябе не начэпіш... З'ездзіла я някепска, хаця дарога была, не прывядзі Гасподзь! Праз увесь былы саюз ехалі, я слязьмі аблівалася — галеча паўсюль. У поездзе маркотна, елі што прыйдзецца, чай бралі ў правадніцы... А час бавілі так: то — карты, то — сон...

— Дарога была, відаць, захапляючая?.. — спытала гаспадыня. — Ты ж столькі пабачыла — стэп, тайгу, Байкал!

— Не, Байкал якраз і не бачыла — ноччу праязджалі, спала. А тайга?.. Дрэвы — як дрэвы. Стэп, Лерачка, такі, што адна пустэча навокал.

— Ну, а Кітай?..

— А ў Кітаі — кітайцы. Праўда, на базары больш рускіх, чым кітайцаў... Вялікім попытам карыстаюцца шынялі нашы, ваенныя, боты, нават фуражкі й папругі. Я дома напакавалася добра, таму *паднялася* няблага.

— Куды паднялася? — здзівілася нейкая худая, уся ў рабацінні, кабета. — На Фудзіяму, га?

— Ды не падала я ні ў якую там яму!

— Выбачайце, — мастак-анімаліст тоўхнуў левым плечуком у правы плячук суседкі. — Вы, шаноўная, нешта ўсё пераблыталі... Фудзіяма — гэта Японія. А Кацярына была ў Кітаі.

Кацярына прыязна кіўнула мастаку-анімалісту і павяла расповед далей:

— Я ж і кажу... Паднялася добра. Ну, атаварылася. У нас, чаўнакоў, так кажуць. Значыцца, прывезла скуры рознай, «адзідасаў», дробязі ўсялякай. У Кітай ездзіць выгадна, гэта — не Польшча.

— Вы нам — пра помнікі архітэктуры, — падаў голас мастак-анімаліст.

— Ой, якія на базары помнікі?!. — пры гэтым Кацярына гучна рагатнула. — Сталы, лаўкі гандлёвыя, навесы, тавар — таўкучка самая нармалёвая... Усё так, як і ў нас на стадыёне. Але навар, кажу, немалы. Збіраюся зноў паехаць куды-небудзь... Можа, нават у Індыю.

— У І-ін-нды-ю?.. — аж застагнаў дзіцячы паэт Шабоцька. — Гэта ж — мая мара, Індыя!

— То — давайце разам, спарымся, — тут жа прапанавала Кацярына. — Шынялі ў вас ёсць?

— Добра, добра... Потым сваю паездку абмяркуеце, — умяшалася Лерачка. — Дзякуй табе, Кацярына... А цяпер няхай Алена раскажа, як яна адкрыла для сябе Стамбул і Канстанцінопаль... Ну? І як там непаўторная Турцыя?

— Нічога дзівоснага, — неяк без асаблівага імпэту пачала свой расповед Алена. — Крамы, камкі... Тавараў — заваліся. А так — гарачыня, нібы ў пекле. І самае паганае — есці давалі два разы ў дзень. І ўсяго толькі на адзін зуб. У нас лепей кормяць. У нас — адной бульбай можна наесціся да адвалу, а калі са шкваркай, дык і гора няма.

На гэтыя яе словы гучна азваўся жывот мастака-анімаліста, але ўсе зрабілі выгляд, што замуркатала гаспадыніна кошка.

— Во, во, — уставіў свае тры грошы мясцовы фірмач Казюлькін. — Я ўсю Амерыку скалясіў, але запомнілася, ведаеце, што? Запомніліся машыны амерыканскія. Неверагодна, колькі ў кожнай сям'і машын! Болей, чым у кожнага з нас чаравікаў. На вуліцах толькі машыны... Можа, і я праз гадкоў так дзесяць які «фордзік» прыдбаю, патрыманы, канешне...

Потым вандроўнікі пачалі абменьвацца ўражаннямі аб сваіх замежных паездках так падрабязна і зацікаўлена, што гаспадыня не паспявала іх перапыняць, папярэджваючы, каб хоць з большага захоўвалі прыстойнасць. Абмеркавалі, як кормяць у Кітаі, якія машыны ў Стамбуле, што можна купіць у Амерыцы.

Падалі каву. Размовы працягваліся. І толькі мастак-анімаліст моўчкі сядзеў каля акна і разва-

жаў-думаў: «Навошта ехаць у Стамбул, калі плову і тут можна наесціся?.. Захацелася пакаштаваць заморскай стравы — ідзі ў «Бульбяную» і еш, хоць пуп расперажы, бульбу ў гаршчочках — колішні прадукт Каларады... А машын і ў нас стае амерыканскіх. То ці варта ў такую далячынь сунуцца, калі ўсе дзівосы ў кіно можна ўбачыць?..»



# РЭКОРД

Існуе такая думка, што раніцою ў добрым настроі прачынаюцца толькі дзеці, закаханыя і... дурні.

Віталь Жыбуль, на жаль, не падыходзіў пад першыя дзве катэгорыі. А на шчасце — і пад трэцюю таксама. Быў ён ужо самавіты мужчына, меў поўныя трыццаць шэсць гадоў. Яго халасцяцкае сэрца на сённяшні дзень не ўздрыгвала ні ад ніводнага жаночага позірку. Наконт апошняга, то гэта таксама не пра яго, бо меў ён вышэйшую адукацыю і працаваў вядучым інжынерам у канструктарскім бюро. Таму прачынацца з усмешкай, як вы разумееце, у яго на гэтае не было ніякіх падстаў, і пасля сну ён выдаваў не надта вясёлы й жвавы.

І гэты раз — раніца была шэрая, за вокнамі — цьмяна, на гадзінніку — каля шасці, а ў кватэры — халаднавата. Пасля значных намаганняў Віталь усё ж расплюшчыў вочы, перакінуў свае думкі ад цікавага сну да будзённа-аднакаляровай рэчаіснасці, як нечакана трывожная думка маланкай прабіла яго чарапок, што адразу ж і выдаў важную інфармацыю: рэкорд! Так, менавіта сёння Віталь Жыбуль вырашыў паставіць рэкорд — свой асабісты, да якога ішоў ужо не першы год. «Сёння альбо ніколі! Так я запланаваў, так і будзе!» — сам сябе настройваў вядучы інжынер.

Ён падняўся — і ў ванну. Усе ранішнія працэдуры, уключна з гімнастыкай і абліваннем вадой,

занялі менш, чым гадзіну. Хуценька нацягнуў тонкую спартыўку, знайшоў пад канапай адну шкарпэтку, другую — выявіў ажно за крэслам. На кухні доўга не затрымаўся — папіў кавы з кавалачкам сыру і гарбушкай зацвярдзелага батона.

Нейкі час засяроджана стаяў перад шафай і разважаў: «Каб паказаць рэкорд, на дыстанцыі трэба быць у нечым спартыўным. Але ж напрыканцы ў мяне — адказная сустрэча, таму не зашкодзіць элегантнасць...» І ён спыніўся на спартыўным гарнітуры, вятроўцы й вязанай шапачцы.

Надвор'е, праўда, не надта каб спрыяла — за акном стаяла імжака ды яшчэ і спрытны дождж хлебястаў па шыбах. Віталь выскачыў за дзверы. Здавалася, усё разлічыў: каб здзейсніць рэкорд, яму трэба не менш гадзіны. Успомніў, што мусіць адзначыцца ў Антона Антонавіча. Ліфт, як звычайна, на выклік не прарэагаваў, і з трэцяга паверха Віталь подбежкі кінуўся на восьмы. Лямпачак даўно ўжо нідзе не было на лесвічнай пляцоўцы, давялося бадай што навобмацак прабівацца.

Жонка Антона Антонавіча, захінаючы стракаты халацік і папраўляючы бігудзі на фарбаваных валасах, здзіўлена глянула на ранішняга госця і шэптам паведаміла, што муж яшчэ спіць, бо з саўны прыйшоў ноччу і вельмі стомлены. Потым пацікавілася:

— А цябе куды гоніць?.. Няўжо зноў на рэкорд наважыўся?

— Ну, гэта пабачым... Выбачайце, Антон Антонавіч няхай, канешне, паспіць. А вы, прашу, зазначце час — сем гадзін, роўна. Я — пабег! — І Віталь кінуўся ўніз.

Аднак бегчы было няпроста — затрымкі пачаліся адразу, як пакінуў ганак: спачатку давялося адольваць шырокую траншэю, якую будаўнікі вырылі дзеля нейкай патрэбы яшчэ тыдзень таму. Яміна была паўнюткая бруднай вады, бо ішоў дождж. Будучы рэкардсмен зрабіў глыбокі ўдых, узмахнуў рукамі й сігануў праз перашкоду... Пакаўзнуўся, але цудам утрымаўся на нагах, хоць і коўзка было. Бег ён спрытна. Сцяжынка увесь час вілася ўздоўж шашы. Гэта быў, па разуменні дарожнікаў, тратуар, але такой назве ён даўно ўжо не адпавядаў, бо нагадваў доўгую пральную дошку: грудок — ямінка, грудок — ямінка... Віталь старанна пераскокваў з грудка на грудок, як той бусел па купінах на балоце. Ліхтары ўжо не гарэлі, а да ўсходу сонца яшчэ далёка, таму нязручна было — баяўся прамахнуцца, але ж затое ногі сухія будуць.

Дождж церусіў як мае быць, ліло за каўнер. Віталь бег і адно адлічваў крокі: «Раз-два, раз-два...» Каля аўтобуснага прыпынку народу сабралася, бы на якой дэманстрацыі, адно не відаць было выступоўцаў. «Мусіць, аўтобусы зноў выбіліся з графіку, — падумаў Віталь, — ці бензіну не хапае, дык знялі колькі рэйсаў...» Ён мог і далей бегчы, праўда, па шашы, бо «тратуар» скончыўся. А лепей — пад'ехаць, бо ўмовамі рэкорду сродкі руху не агаворваліся.

Чакаць давялося хвілін з дзесяць. У першы аўтобус не ўлез. Да другога — не дабег. У трэці — ледзь уціснуўся праз заднія дзверы. І ладна-такі прымасціў сваю галаву ў падпашша нейкаму дзецюку,

а рукамі ўчапіўся ў торбу, упёртую яму ў нос. Такая язда нікога не здзіўляла. У аўтобусе было цёмна, вільготна і душна, але ехаць усё ж лепш, чым бегчы пад дажджом.

Праўда, на прыпынках яго штурхалі, бо чамусьці ўсе тыя, хто ўваходзіў праз пярэднія дзверы, намагаліся выйсці праз заднія. І наадварот. Гэтыя дзве плыні стваралі нешта накшталт млына — пераціралі адзін аднаго, але ніхто не папракаў нікога, бо кожнага турбавала адно: толькі б не праехаць свой прыпынак. Нехта ціхенька енчыў, стагнаў, калі хтось «прагульваўся» па ягоных нагах ці незнарок локцем балюча тоўхаў у патыліцу. Віталь, як мог, згінаўся, скурчваўся і намагаўся нават зменшчыцца. Ад пабочных націскаў ён пачаргова займаў то першую балетную пазіцыю, то другую, а калі абдымкі натоўпу станавіліся задужа моцнымі — нават пятую. І ўсё ж — нарэшце заспакоіўся, калі прываліўся да жалезнага прута, глыбока выдыхнуў, каб менш ціснулі на грудзі. Якраз у гэты момант з кабіны вадзіцеля данеслася:

— Пасажыры, па тэхнічных прычынах аўтобус далей не пойдзе... Просьба пакінуць салон!

— Каб на цябе халера!.. — ад усяго сэрца пажадаў Жыбуль, пры гэтым выкуліўся з аўтобуса на дождж і стаў аглядацца, дзе апынуўся.

Да наступнага прыпынку было недзе метраў дзвесце, і ён — час прыспешвае! — подбежкі патрусіў наперад.

Фініш быў не за гарамі. Трэба адно перабегчы шашу. Іртануўся быў на праезджую паласу, але

ўбачыў «зебру» і спыніўся. Мусіў чакаць, пакуль нехта з «вадзілаў» прыпыніць свой лімузін і дасць яму «зялёнае святло». Але дзе там — машыны ляцелі адна за адной, як навыперадкі. І тады Віталь, злаўчыўшыся, перабег перад носам у адной, ззаду — у другой, а з трэцяй машынай размінуўся так, што бадай не патрапіў пад колы. Яго слых улавіў скрыгат тармазоў і запознены посвіт міліцыянера, бо кандыдат у рэкардсмены прыпудзіў так, што ў міг вока апынуўся ў нейкім цёмным двары. Адтуль, каб скараціць дарогу, пашыбаваў у бок будаўнічай пляцоўкі, дзе каторы ўжо год работы прыпыненыя ад недахопу сродкаў.

У плоце было шмат дзірак, і дошку не давялося аддзіраць. Пралез за плот і хацеў зноў бегчы, але набухлая ад дажджу гліна, па якой вілася вузкая сцяжынка, стала чарговай перашкодай. І ўсё ж таксяк пераадолеў і гэтыя цяжкасці, затым яшчэ раз пралез у дзірку, абмінуў кучу смецця, павярнуў управа і вось — нарэшце! — узбег на патрэбны ганак КБ.

Каля дзвярэй, з асалодай пацягваючы цыгарэтку, чысцюткі, адпрасаваны, у наваксаваных чаравіках, у бездакорным капелюшы, Антон Антонавіч даваў нейкія слушныя парады свайму шафёру Арнольду. Той слухаў і старанна праціраў бялюткай анучкай лабавое шкло «мерседэса». Убачыўшы перапэцканага, змоклага і зморанага Віталя Жыбуля, Антон Антонавіч уважліва паглядзеў на свой гадзіннік і сказаў:

— На жаль, галубок, рэкорду і сёння не атрымалася... Ты спазніўся на працу ажно на сем секунд! Гэта сведчыць аб адстутнасці ў цябе мала-

мальскай дысцыпліны, а таксама — аб тваёй хранічнай бестурботнасці. Сорам!.. Каторы раз абяцаеш не спазняцца — быць на рабоце роўна ў восем. І вось — чарговае спазненне. Бяры, суседзе, прыклад з мяне — я ніколі яшчэ не дазваляў сабе спазняцца.



## НЕВЕРАГОДНЫ ВІЗІТ

Навагодняя ноч — самая незвычайная, самая чаканая, поўная захапляльных прыгод, вяселля. З даўніх часоў існуе павер’е, што ў гэтую ноч адбываюцца сапраўдныя цуды...

І вось, напярэдадні свята па ўсім шматпавярховым будынку Навукова-даследчага інстытута мінералогіі разнеслася ашаламляльная навіна: у інстытут прылятаюць іншапланецяне!

— Глупства! — у адзін голас сказалі, як адрэзалі, скептыкі. — Нават скульптуры вострава Пасхі, Тунгускі метэарыт і лятаючыя талеркі не даказалі, што такое магчыма. І раптам — іншапланецяне? Памятаеце, мы чакалі Піліпа Кіркорава, пера-апранутага ў Дзеда Мароза, і дарма.

— А чаму і не?!. — намагаліся сцвердзіць сваё больш мастацкія натуры. — Цывілізацыя рухаецца наперад, а наш інстытут ужо наведвалі кіеўляне і новасібірцы, масквічы й азербаджанцы. Былі казахі, нават прадстаўнікі з Германіі, а гэта — таксама не блізкі свет. Дык чаму ж не могуць завітаць да нас пасланцы з іншай планеты?

Тэхнічна адукаваныя, знаёмыя з самай дакладнай апаратурай супрацоўнікі аддзела перадавых тэхналогій пры дапамозе аналізу перашкод на асцылаграмах вылічылі, што карабель з іншапланецянамі набліжаецца з хуткасцю дваццаць шэсць кіламетраў у секунду, і шляхам дэдуктыўнага

метаду цвёрда заявілі: «Прызямленне адбудзецца 1 студзеня роўна ў 00 гадзін і 5 хвілін».

Не адсталі ад іх і навукоўцы аддзела «Гісторыі камянёў». Іх чуткія прыборы й апошняя навінка «Позірк праз камяні» дазволілі ўдакладніць, што карабель ляціць з суседняй Галактыкі, туманнасці Табапаса, моцна дыміць і пакідае пасля сябе бычкі розных ступеняў. Табапаса бачна ў паўднёвым паўшар'і ў выглядзе дзвюх цьмяных плям, якія астраномы назвалі «вугальнымі мяшкамі».

Хуценька ўключыліся ў работу статысты, якім не прывыкаць да астранамічных лічбаў. Нават не рызыкуючы нанесці шкоду гадавой справаздачы, імгненна вызначылі каардынаты планеты: маўляў, яна сярэдніх памераў, сігарападобнай формы, размяшчаецца ў сузор'і Курца і мае назоў Нікаціандра.

Усе звесткі яшчэ раз праверылі супрацоўнікі аддзела «Хімія камянёў» і, зрабіўшы дыстанцыйны аналіз хімічнага саставу атмасферы загадкавай планеты, пацвердзілі: «99.9 працэнтаў складае нікацін, дым, вугаль, вокіс вугляроду і аміяк; планета самая загазаваная і адна такая брудная ў сваёй Галактыцы».

— А па-мойму, яны лятуць да нас, — узнёсла пачала сакратарка Віка, — каб пераняць вопыт па барацьбе з курэннем. Наша справа — дапамагчы ім!

— Уяўляю, — азвалася самая ўразлівая маладзенькая супрацоўніца аддзела «Жыццё камянёў» Насця, — як яны ўсе выглядаюць: змарнелыя, нізкага росту, вочы — чырвоныя, слязлівыя, грудзі — упалыя, твары — зямлістыя... Страшна хворыя суб'екты.

— Цікава, то якія ў іх страўнікі, печань, ныркі, лёгкія?.. — задумліва спытаў супрацоўнік аддзела «Паталогія камянёў» Сакратаў; перад ім на стале ляжалі Малая і Вялікая энцыклапедыі, два маляўнічыя атласы, выдадзеныя ў замежжы.

— Што ж нам рабіць? — занепакоена бліснуў вачыма супрацоўнік аддзела «Чыстыя камяні» Пераваротаў, які ад хвалявання браў з попельніцы тлеючыя бычкі, жаваў і глытаў.

— Разважаць ды панікаваць няма калі, — узяла на сябе кіраўніцтва старшыня прафкама Магутная, жанчына на ўздзіў худушчая і невысокая. — Трэба рыхтавацца да сустрэчы. Усё праверыць, усё падсумаваць... Я маю на ўвазе дакументацыю. Я пераканалася, што паперкі й лічбы ў першую чаргу цікавяць усіх прыязджаючых. І гэтыя... прылятаючыя, не лепшыя.

— Намецім зараз жа план мерапрыемстваў, — патдрымаў яе намеснік дырэктара інстытута Цэрахаў.

— А мне ўсё роўна, — прапела на матыў вядомай песні прывабная гарэза Зіначка, якая загадвае буфетам, і ўзялася на ўсялякі выпадак прыбіраць з вітрыны ўвесь асартымент табачных вырабаў.

Улічваючы кодавыя замкі на дзвярах, ахову і пільнасць вахцёраў, вырашылі, што арганаўты трапяць у інстытут праз адзіны на гарышчы люк.

— Няхай не разлічваюць на гарачы прыём ды кветкі, — заспакоіў усіх дырэктар інстытута. — Яны ж нас не апавясцілі, тэлеграм не слалі... Нават факс не перадалі. Таму зробім выгляд, што для нас іх прылёт — сюрпрыз, нечаканасць.

— Калі прыйдзецца ім уваходзіць праз гарышча, дык адразу ж апынуцца на пляцоўцы сёмага паверха,

дзе ў нас курыльня... Гэта не пажадана, бо што пра нас падумаюць? Там жа дым — каромыслам, хоць сякеру вешай.

— А можа, гэтак і лепей, — пасміхнуўся заядлы курыльшчык з «Паталогіі камянёў» спадар Сакратаў. — Яны пройдуць адаптацыю, бо рэзкая перамена атмасферы можа незямлян пагубіць... У нас там паветра бадай такое ж, як і на планеце Нікаціандра, калі не горш. А пасля ўжо мы ім пакажам нашы лабараторыі, дзе паветра чыстае і празрыстае. Толькі трэба прыкрыць нечым ва ўсіх кабінетах і на сценах надпісы «Курыць забаронена». Іначай не асмеляцца дыхаць на ўсе лёгкія.

Падрыхтоўка да сустрэчы іншапланецянаў закруцілася ва ўсю: усюды развесілі плакаты па антытабачнай прапагандзе, наладзілі скразное праветрыванне ўсіх месцаў, дзе нехта некалі курыў, уключылі на ўсю моц кандыцыянеры, правялі генеральную чыстку пісьмовых сталоў і шафаў, арганізавалі серыю лекцый пра шкоду курэння, у выніку чаго яшчэ 17,5 працэнтаў ад усіх курцоў інстытута пазбавіліся шкоднай звычкі. Нават Сакратаў выкінуў свае заморскія цыгарэты ў сметніцу і стаў смактаць карамелькі з назовам «Узлётная».

Час не чакае — стрэлкі гадзінніка няўмольна рухаюцца наперад. Адлятаюць апошнія лісткі календара старога года: 5, 4, 3, 2, 1... Старт ці фініш?

Сустрэча не за гарамі. Будзем усе напагатове, спадары-таварышы. Не падвядзіце!

## ВЕЛЬМІ АДКАЗНАЯ РАБОТА

Брыгадзір Зёлкін нейкі час пільна ўглядаўся ў поўныя чакання і нецярпення твары чальцоў сваёй каманды, потым, як звычайна перад пачаткам работы, пачаў інструктаж:

— Так, давайце яшчэ раз усё абмяркуем, падсумуем і намецім план дзеянняў на сённяшні дзень. Работа ў нас, самі ведаеце, вельмі адказная, працуем з людзьмі, а гэта — не абы-што. Кожны чалавек — інды-ы-ві-ідуальнасць, — зачапіўшыся за нязвыклае слова, ён з імпэтам прадоўжыў: — Таму галоўнае — гэта ўвага, пільнасць і...

— Кемлівасць, — падаў танклявы галасок самы маладзейшы чалец калектыву.

— Во-во, менавіта кемлівасць, — з задавальненнем пацвердзіў брыгадзір.

— Ветлівасць! — сакавіта гучным басам выгукнуў дзябёлы мацак з сівымі скронямі.

— Вось-вось, гэта, бадай, самае правільнае — ветлівасць, — паважліва паглядзеў на свайго старэйшага калегу Зёлкін. — Без ветлівасці ў нашай справе ніяк нельга. Грубасць ставіць нас на адну дошку з самымі адпетымі прайдохамі.

— Дыстанцыю стварае толькі пачцівасць, — выдаў на гара́ афарызм рабаваты мужчына з інтэлектуальным тварам.

— І ахайнасць, акуратнасць, — зазначыў жвавы хлопец у бездакорна адпрасаваных штанах з вострымі стрэлкамі й да бляску наваксаваных чаравіках.

— Ну, так, вядома... Гэта асабліва не пашкодзіць тым, хто абслугоўвае жанчын. Гэты народ, самі ведаеце, занадта капрызны й даволі назіральны — усё заўважаюць, і калі ваш выгляд будзе ім недаспадобы, можаце застацца без работы.

— А я лічу, што і сілу мець не лішне, — калыхнуў атлетычнымі плячыма былы спартсмен Булава. — Часам так сітуацыя складзецца, што без сілы з нашым кліентам не размінешся.

— Ну, на сілу, хлопцы, не вельмі налягайце — толькі ў выключных выпадках, — не пагадзіўся Зёлкін. — Тут усё правільна казалі: каб кліент нам давяраў, трэба быць і акуратнымі, і ветлівымі, і ўважлівымі. Работа наша такая!

— Можна пытанне? — нервова адкашляўся, падобны да студэнта, хударлявы дзяцюк у акулярах. — А што рабіць, калі кліент вельмі неспакойны? Можа і нахаміць, і рукі ў ход пусціць, лямант падняць...

— Ну, даражэнькі, прашу запісаць сабе на лбе: не мы для кліента, а ён — для нас, — па-бацькоўску лагодна пачаў ушчуваць брыгадзір. — Галоўнае — цярплівасць і яшчэ раз цярплівасць. Ніякага абурэння ў адказ, заўсёды ветлівая ўсмешка і пяшчотны голас. Дарэчы, і рукі мусяць ласкавымі быць. Рукі — самы ўразлівы момант у нашай справе. Іх трэба трэніраваць і берагчы, як нішто іншае. Гэта ж наш самы галоўны рабочы інструмент. Помніце, калі ў Грымзы быў палец вывіхнуты? Кліент адразу адчуў няладнае — многія заўчасна пакінулі салон. А гэта недапушчальна! Мы павінны высока трымаць нашу марку. Рукі нашы павінны быць гладкімі, ласкавымі — як у дзяўчат. Ад гэтага залежыць эфект нашай працы.

— Я так разумею: ва ўмовах рынку нам трэба карэнным чынам змяніць тактыку, — утачыўся ў

размову ружавашчокі кучаравы юнак, — бо сёння колькасць не пераходзіць у якасць. Лепш абслужыць менш кліентаў, ды лепей.

— Вось гэта слушна, шаноўны... Гм, не помню твайго прозвішча. Правільна, нам як хутчэй трэба прыстасоўвацца да новых умоў і не ганяцца за колькасцю, ад гэтага толькі розныя непрыемнасці... Кліентура далёка не ранейшая, таму і стаўкі іншыя.

— Ударым па кліенце пяшчотай і любоўю, — згадаў незабыўныя словы Бендэра нядаўні выпускнік школы. — Я асабіста працую толькі так і ўсім гэтак раю — з любоўю і пяшчотай!

— Але-але. Магу канстатаваць. Вынікамі працы Барабаша я задаволены. Сапраўды, яго ККД у нашай брыгадзе самы высокі. Ну, хопіць балбатаць — за працу. Бачыце, кліент ужо чакае. Час — грошы!.. Разаб’емся, як і ўчора, на групы — па трое на салон. Адзін — адцягвае ўвагу, другі стварае непрыкметную штурханіну, а трэці — хутка і акуратна праводзіць рэвізію сумачак і кішэняў...

І тройкі асобаў нябачнага фронту імкліва накіраваліся на аўтобусны прыпынак, загадзя выглядаючы ў натоўпе пасажыраў чарговую ахвяру.



# КОЛЬКІ ЖЫВЕ ПАВУК?

Напярэдадні першага лістапада Міхась Зыгмант, як звычайна, патэлефанаваў у домакіраўніцтва, каб удакладніць, колькі ў гэтым месяцы трэба плаціць за камунальныя паслугі па новым тарыфе. З месяца ў месяц гэтыя лічбы, незалежна ад надвор'я альбо непрадбачанай стыхіі, няўмольна паўзлі ўверх, як слупок ртуці на градусніку грыпуючага.

— Дзень добры... Гэта Зыгмант з 45 кватэры. Так-так, як заўсёды, хачу запісаць новыя тарыфы. Не, зайсці не магу — нага ўсё яшчэ баліць... Дык я слухаю, аловак ужо завостраны. Увесь — увага. Гм, э-э... Ясненька. Кватэрная плата ў трыццаць разоў вырасла? І ўсе мае метры памножыць на трыццаць... Так-так. Што — і за куню, і за санвузел? Памножыць... Зразумеў. Не за мяжой жыву — усё разумею. Плюс вада гарачая, халодная... Памножыць на дзесяць? Памножу. Даруйце, а што гарачай не было аж дванаццаць дзён, га? Ах, домакіраўніцтва не вінаватае. А хто ж? Бойлерная?.. То чаго ж гэта яна, ваша Бойлерная, грэе ваду, калі ёй хочацца?.. З норавам, відаць, кабеціна!.. Добра, добра — маўчу. Пішу далей.

За радыё і антэну ў чатыры разы? Што ж, памножу, так. Э-э, даражэнькая, на дзяльбу я ўжо і забыўся — усё памнажаю ды складаю. Ну што там яшчэ? Ага, электрычнасць і газ. Памножыць на сем... Так, запісаў. Тэлефон... І наколькі ж? Памножу, канешне. І на смеццеадвод не забыць на

шэсць памножыць? Але ж ён увесь час забіты... Я са свайго пятага паверха смецце нашу ажно праз тры двары ў кар'ер. Гэта не прычына? Зразумеў.

Жыўнасць якая?.. Ну, сабачка. Яго на восем памножыць? Божа мой, ён жа такі маленькі, як хамячок, што і на два разы не набрэша. Ваду і газ спажывае? Раўнапраўны член сям'і?.. Здарава, я не ведаў гэтага. Пра хамячка забыў? Якога хамячка? Няма ў мяне хамячка. Гэта сабака ў мяне такі маленкі, бы хамячок ці кацяня... Ой, ды няма ў мяне ні хамячка, ні кацяня!..

Хто гэтак шчабеча-чырыкае? Птах у мяне жыве. У клетцы. Так, папугайчык. Зусім малы, увелькі з мізінец. Што-о? І за яго трэба? А колькі? Зноў падвоіць?.. Аж — патроіць? Ну, ведаеце!.. Гэта ўжо нейкая астранамічная лічба атрымліваецца. Мае праблемы?.. Ну пэўна ж — не вашы. Але ж гэты мой птах, як муха тая, а такія выдаткі!

Што-што? Ці мух многа?.. Лётае некалькі, каб на іх халера. Падлічыць? І плаціць трэба за кожную паасобку? Але ж я ўзяўся іх перабіць. Не чапаць?.. Даруйце, гэта ўжо нешта зусім новае. Я разумею, нішто і ніхто сёння не стаіць на месцы, але ж — хоць за мух не чапляйцеся. Муха — стварэнне Божае... Ваша праўда, могуць і іншыя заляцець, вунь сонейка паказалася... Лепш за гэтых заплаціць...

Хвілінку! У мяне ў куце павук сядзіць на павуціне... Чуеце? От ён, павучыска, і паловіць мух. Што? І яго таксама ўлічыць? О-о, ён дастойны ўвагі, улічу абавязкова. Памножу ўсё, складу. І вось яшчэ — апошняе пытанне: калі ў вас прымаюць заявы на пашырэнне жылплошчы?.. Не, я не разумею

вас: самі ж казалі, каб за ўсіх, хто жыве ў маёй кватэры, плаціў столькі ж, як і за самога сябе... У мяне іх вунь колькі назбіралася! Менш трох метраў выпадае на кожнага з нас — ніжэй усялякіх нормаў. Не вы, а камісія вырашае? Давайце камісію! Што-што? Буду чакаць столькі, колькі павук жыве?.. Чакайце, а колькі ён жыве, павук?.. Ах, і гэтага не ведаеце. Што ж вы тады ведаеце?



# КАЛІ ХВАРЭЕ НЕМАЎЛЯ...

Яны сядзелі побач перад кабінетам урача, трымаючы на руках свае маленькія скрутачкі. У адной, мілавіднай бландзінкі ў джынсах і зялёным швэдары, з коўдрачкі выглядвалі жвавыя вочкі, бы тыя чорныя парэчкі. Немаўля з цікавасцю аглядала столь, сцены. У другой, паўнаватай, з валасамі, пафарбаванымі ў дзівосны фіялетавы колер, у акулярах, — у скрутачку нехта ціхенька пасапваў, бачны быў толькі кірпаценькі носік ды заплюшчаныя вочкі.

— У вас — хто: хлопчык або дзяўчынка? — запытала першая, зацікаўлена ўглядаючыся ў заплюшчаныя вочкі.

— Дзяўчынка, — з пяшчотай адгукнулася суседка. — Ды вось гора — захварэла, не есці, нудзіць, а зараз задрамала, мая лялечка.

— Ой, не кажыце. А мой хлопчык нешта кашляе... Дыхае цяжка, мусіць, прастыў, не дай Божа... Каб не запаленне якое...

— Не, на выгляд ён у вас жвавенькі, вунь як паглядае весела, вочкі blішчаць. У маёй такое было ў месяцы тры: і з носіка цякло, і пярха́ла... Таблеткі, мікстуру давала — і ўсё прайшло. І ў вашага пройдзе.

— Дай Божанька! А то сэрца рвецца, так шкада немаўля — маленькае ж зусім, усяго чатыры месяцы...

— Ну, не трэба так трывожыцца... Доктар наш вельмі добры, чулы... Я ведаю яго — дапаможа.

— Ой, каб толькі паздаравеў мой маленькі... З такімі ж немаўляткамі ўсякае бывае, — цяжка ўздыхнула бландзінка, цішком выціраючы слязу. — Глядзіце, ваша дзеўчанятка вочкі расплюшчыла, пазяхае...

— Ах, мая ты кветачка, — цалуючы кірпаценькі носік, амаль праспявала пафарбаваная жанчына. — Маё золатка маленкае... — Крыху паправіла коўдрачку — і над ілбом немаўляці закучаравіліся чорныя валасы.

— Прыгожанькая якая, кучаравенькая...

— Уся — у бацьку... Ён у нас сапраўдны прыгажун. І знакаміты ў сваіх колах. Праўда, усё па замежжах ездзіць — розныя выставы, сустрэчы, дамовы... Ну, і маці не абы-што, — пры гэтым яна неяк какетліва падправіла сваю фіялетавую прычоску.

— Так, так, — падтакнула суседка ў знак падтрымкі. — Ад добрага семя будзе і добрае племя.

— Мы толькі на гэтае і спадзяемся... Па бацьках можна меркаваць і пра дзяцей.

— Вось-вось, у нашым раду таксама ёсць знакамітыя, — не здавала сваіх пазіцый і бландзінка. — Нават узнагароды маюць... Скажам, дзядуля наш... Хто ведае, можа, і параднімся некалі.

— Час пакажа, — ганарліва павяла плечуком жанчына з фіялетавай прычоскай. — Спадчыннасць у нас іншая...

— Слухаю вас і здзіўляюся, — уклініўся з размову мужчына, які сядзеў насупраць — па выпраўцы, відаць, ваенны. — Песціце вы надта сваіх малепаў... Мая жонка гэтак жа сама турбавалася-песціла, лашчыла ды сюсюкала, а цяпер во яму рады аніякай

даць не можам, — паказаў на свайго хлопчыка, якому гадкоў недзе за тры, не больш; той адвярнуўся ўбок і нечага злосна тупацеў нагамі. — Бачыце, нораў свой паказвае... Гэта ж — не хацеў да ўрача ісці. Цяпер я за выхаванне ўзяўся, але трэба было раней...

У гэты час адчыніліся дзверы кабінета і фельчар абвясціў:

— Так, заходзьце... А тыя, хто без прышчэпкі ад шаленства, — да медсястры... Гм, зараз паглядзім вашага пінчара, а потым — і вашага эрдэльтэр’ерчыка, — ён глядзеў у бок жанчыны з фіялетавай прычоскай.

Злосны баксёр ваеннага раптам гучна забрахаў і пагрозліва замахаў абрубкам хваста.



## НЕ ЗАКРЫВАЙЦЕ РОТ...

У інжынера Івана Журбы два дні балеў зуб. Увесь гэты час небарака амаль не спаў і нічога не еў. І вось — нарэшце сядзіць ён у крэсле зубнога доктара, шырока разявіўшы рот, вылупіўшы вочы і давячыся слінай... Кавалкі ваты, здаецца, памерамі з тэнісныя мячы, былі ўпіхнуты яму за шчаку, ад чаго рот ягоны нагадваў пашчу міфічнай Харыбды, якая рыхтавалася праглынуць карабель Адысея.

Дакторка, у акулярах і з марлевай маскай на твары, нешта вельмі доўга корпалася ў зубе, тым самым, верхнім, сямёрцы, раўняючы, падпілоўваючы, утыкаючы спаміж зубоў нейкія вострыя дроцікі, пласцінačкі. Час ад часу яна совала ў рот інжынера круглае люстэрка на тонкім бліскучым дзяржаку і паглядала ў яго. Па ўсім відаць, яна была задаволеная сваёй работай, дарма што яе кліент, здавалася, ледзьве дыхаў і не мог дачакацца канца пакут.

— Ну, вось і ўсё, — здымаючы марлеўку і акуляры, весела паведаміла дакторка. — Толькі не закрывайце рот... Хвілін пяток прыйдзецца пацярпець, пакуль пломба падсохне. Яна ў нас дэфіцытная, каб ведалі, срэбная.

Інжынер згодна кіўнуў у адказ, міжволі глынуўшы сліну, якой сабралася багата. З разяўленым ротам глытаць было так нязручна, што, здавалася, верхняя сківіца ажно трашчала, а косткі ў шыі пачаргова хрумсцелі. Дакторка тым часам звярнулася

да суседняга крэсла, дзе яе калега з імпэтам буравіла бормашынай кутні зуб крутаплечаму дзецюку.

— Ну, дык вось, я ж табе рэцэпт абяцала... Не салата — смакоцце. На святы цяпер толькі яе і гатую. Галоўнае, што хутка. І смак, кажу, неверагодны! А ўсё — проста: бяру бурачкі, на тарцы націраю, потым туды — чарнасліў, арэхі, часнок, маянэз... Што вы, хворы, нешта пнецеся? Цішэй, не круціцеся... І рот не закрывайце. Чуеце? Не закрывайце рот!

Калега з суседняга крэсла, зацікаўленая тэмай, на момант прыцішыла сваю пякельную машыну і горача падтрымала размову:

— Так, салата цудоўная, я каштавала... А я прыгатую на свята курыцу па рэцэпту Раісы Паўлаўны. Гэта і выгодней, і зручней. І проста: абсыпаю соллю, перцам і абавязкова — молатым часнаком. Пастаіць у холадзе некалькі гадзін, а як сок пусціць, зверху — маянезам. І ў духоўку. Ой, смак — пальчыкі абліжаш... Глядзі-ка, нешта твой зноў пачырванеў?

— Што-о?.. — схамянулася першая дакторка. — Што з вамі, хворы?.. Не закрывайце рот. Ах, сліна перашкаджае? А вы глытайце, глытайце... Яшчэ трошкі пацярпіце. — І зноў — да каляжанкі: — Трэба ж, такі нецярплівец трапіўся. Во, нарэшце супакоіўся. Дык слухай. Нешта цікавае скажу... У мінулую суботу мы былі на юбілеі ў Пардонава. Ну, таго самага, які з маім працуе. Вось там быў стол — адны прысмакі: ікра, лімоны, вэнджаніна з хрэнам... Цуд! А гуркі марынаваныя! Так і растаюць у роце, так і растаюць...

— Глянь, зноў твайму нядобра.

— Ой, хворы, не закрывайце рот. Адкуль столькі сліны, га?.. Аж пасінеў, бедачына. Што за народ

пайшоў, аніякай вытрымкі... Яшчэ ж і трох хвілін не прайшло. Пачакайце яшчэ крыху, няхай пломба як след падсохне... Дык на чым я спынілася?

— Смачныя гуркі ў Пардонава...

— О, Пардонавы — багацеі. Пасля танцаў — ля фуршэт... Шампанскае, апельсіны. Сакавітыя апельсіны, ну толькі што з Марока...

— Твой зноў чырванее.

— Хворы, ну пацярпіце яшчэ трошку... Пломбы шкада. Не закрывайце рот. Нельга. Ды не забудзьцеся, што дзве гадзіны нельга нічога есці й піць.

Іван Журба яшчэ раз з гучным булькannем глынуў сліну, нечага раптам хапіўся збялелымі пальцамі за крэсла.

— Вы мяне даканалі, — ледзь выдыхнуў ён праз вату, пры гэтым галава яго кіўнулася ўбок і знерухомела: чалавек страціў прытомнасць.



## МАРАФЕТ НА ХАЛЯВУ?..

У адзін пахмурны снежаньскі дзень на Калектарным завулку рабілася нешта неверагоднае. Прахожыя здзіўлена спыняліся і, гледзячы адзін на аднаго, паціскалі плячыма. Яны занепакоена ўглядаліся ў трэці пад'езд, да якога з сірэнай-мігалкай падляцела міліцэйская машына. Двое дужых малайцоў у міліцэйскай форме выхапіліся з машыны і ў мірг вока зніклі ў цемры пад'езда.

— У 37 кватэру, — удакладніў Пецька, які з такой нагоды не вельмі спяшаўся ў школу і з ранцам за плячыма ўсё круціўся каля натоўпу, вывучаючы абставіны, каб пасля заявіцца ў свой пяты клас з клёвай навіною.

Разявакі распытвалі адзін аднаго:

— Што там здарылася, га?

— Ці не абрабавалі...

— А мо забойства?

І зноў пранізліва рыпнулі тармазы — падкаціла «хуткая». Гэты раз ужо дзве дзеўчыны ў белых халатах подбегам кінуліся ў пад'езд.

Натоўп не разыходзіўся. Людзей большала. Невядомасць заўсёды інтрыгуе цікаўных, і пайсці, нічога не ўведаўшы, зможа толькі хіба адзін з дзесяці. Але ж і сапраўды нешта здарылася неардынарнае — ад'ехала міліцыя, за ёй — «хуткая». Затое тут жа з'явілася новая «хуткая», з якой няспешна выйшлі ажно ці не пяцёра мужчын у белых халатах і рушылі

цугам па лесвіцы ў 37-ю. Яны доўга там былі, але вярнуліся ў машыну без хворага.

А ўсё ж нешта здарылася з жыльцом гэтай кватэры, Змітруком Рымшай, чалавекам маладым, прыстойным, з вышэйшай адукацыяй. Бліжэй да вечара каля дома зноў спынілася машына — «Рафік» з чырвоным крыжам на бакавінах. З яго выйшлі немаладыя, мусіць, вельмі адукаваныя дактары. Ліфт у пад'ездзе ёсць, але не працуе, і гэтым чатыром знакамітасцям давялося пехам дабірацца на шосты паверх...

І толькі назаўтра стала ўсім вядома, што адбылося... Малодшы навуковы супрацоўнік аднаго з НДІ Змітрук Рымша прыехаў з камандзіроўкі ў стане знямогі й празмернай стомленасці. Прылёг на канапу, каб крыху адпачыць, прывесці сябе ў адпаведную форму, а потым...

Потым яго чакала шмат спраў: магазін, дзе мусіў купіць прадукты, хімчыстка, адкуль трэба забраць гарнітур... Потым — новы замежны кінафільм, што дэманстраваўся ў «Кастрычніку», і нарэшце — лазня, бярозавы венік, які набудзе ў лазеншчыка дзядзькі Сцёпы. А там — можна зайсці да Тамары, сястры, якая пачастуе наліўкай і добра пакорміць, бо з той самай пары, як разбегліся яны з Насцяй з прычыны процілегласці характараў, кола яго халасцяцкай жыткі кацілася спрэс па камянях: падскоквала, кулялася і так, і гэдак. Затое — сам сабе гаспадар. Ніхто не трашчыць сарокай над вухам, не павучае. І не трэба амаль заўсёды, калі пасядзіш з сябрам за куфлем піўка, выслухоўваць папрокі. Галоўнае ж — без аліментаў адкалоўся, Насця не зацяжарыла. Збаялася, што адной прыйдзецца з дзіцем забаўляцца.

А жанчын хапае. Вунь, Марына з малочнага аддзела. «Гастраном» вялікі, людзей — мора. А яна заўсёды так ветліва яго абслугоўвае, усміхаецца, нават чырванее. З чаго б такое? Прадаўцы нашы проста так не ўсміхаюцца — гэта ўсім вядома. Аблаяць — тут жа так мацюкнуць, што хоць стой, хоць падай. А яна — прыгожанькая, зграбненькая. Хараство ў спадніцы! Дарма, што без вышэйшая адукацыі. Але што з таго дыплома ўзяла Насця?.. Адно язык ходырам ходзіць, спакою не ведае. Дужа вучаная, а для сямейнай жыткі непрывучаная. Хм, Марына... Не-е, жаніцца зноў — не прывядзі Гасподзь! Трэба нацешыцца свабодай, тое-сёе ў кватэру прыдбаць, а галоўнае — дысертацыю абараніць...

Думкі наплывалі адна на адну, як хмары на сонца. Усё некуды паплыло, паехала...

— Толькі на паўгадзінкі... — прамармытаў сабе пад нос Змітрук, ужо адарваўшыся ад рэчаіснасці й куляючыся ў нейкай касмічнай прасторы...

Але здараюцца часам незвычайныя, незразумелыя з’явы — не прачнуўся ён ні праз паўгадзіны, ні праз гадзіну, ні нават праз дзень і два. Званіла сястра, грукала ў дзверы суседка, пакуль не ўспомніла пра ключ, які пакінуў ёй Змітрук, каб палівала кветкі, калі ён ад’язджаў у камандзіроўку. Адамкнула дзверы — і знямела: Змітрук ляжаў на канапе і не звяртаў на яе аніякай увагі. Яна ўзняла крык, стала тузаць яго, клікаць... Нарэшце патэлефанавала ў міліцыю. Міліцыянты крыміналу не выявілі, спасласліся на дактароў: маўляў, няхай тыя шукаюць прычыну.

Маладзенькая дакторка паслухала, пастукала, асцярожна прыўзняла павека і зазірнула ў нерухомае Змітрукова вока.

— Нешта незразумелае, — сказала яна няпэўна. — Чалавек быццам спіць, але прачнуцца не можа. Сэрца амаль не чуваць, дыханне — таксама... Што ж, зробім электракардыяграму, здымем біяпатэнцыялы з кары галаўнога мозга... — І яшчэ дадала некалькі вельмі мудрагелістых спецыяльных тэрмінаў, што сведчыла аб яе эрудыцыі, пасля выклікала спецыяльную нейрахірургічную брыгаду.

Прыехала брыгада. Абматалі Змітрука мноствам правадоў, спісалі стос папер. Кансіліум дактароў паставіў катэгарычны дыягназ: летаргічны сон.

Змітрукова сястра збянтэжылася:

— Што гэта?.. Ад чаго? У нашым родзе зроду такой хваробы не было. — І звярнулася да самага паважнага з нейрабрыгады: — Скажыце, а колькі ж гэты яго сон будзе доўжыцца?.. Як яго даглядаць? Можа, у бальніцу трэба?

— Не хвалюйцеся, ён можа праспаць і месяц, і больш, і нават некалькі гадоў, — супакоіла сястру ўчастковы доктар. — Будзем ставіць капельніцы... Ёсць розныя працэдуры. А ён няхай спіць, пакуль не прачнецца.

Ляцелі тыдні, месяцы. Прайшоў год, другі, трэці на сыходзе. А Змітрук спаў сабе і не думаў прачынацца. Выглядаў ён нядрэнна, быццам і памаладзеў. Яго мылі, стрыглі, галілі. Кармілі сапраўды праз капельніцу. Тамара, калі б дэманстравала спячага брата свайго за самыя малыя грошы, хоць бы й за такую суму, якой варты музейны квіток, яна значна магла б палепшыць свой бюджэт, але дактары забаранілі пускаць наведвальнікаў, каб, крый Божа, не прычапілася якая інфекцыя.

Змітрук, здаецца, і не збіраўся прачынацца. Мусіць, не так і кепска ён уладкаваўся, асабліва ў такі складаны час. Гэта ж трэба, заснуў якраз тады, калі так добра раскруцілі перабудову, галоснасць і абвясцілі паскоранасць на ўсіх франтах. Спаў ён, як пшанічку прадаўшы, ажно без малога тры гады, начхаўшы на палітычна-эканамічную бязглуздіцу з пашырэннем рынку, шаленствам цэн і ўсімі астанімі цяжкасцямі жыцця.

— А ўсё ж — хітры наш Змітрук, — не без зайздрасці калі-нікалі заўважала Тамара. — Я тут б'юся, як рыба аб лёд, а ён спіць сабе, а калі прачнецца, дык можа ўсё як след усталюецца, жыццё стане лепшае за казку... Крамы ламіцца будуць ад тавару.

— Што ж, няхай паспіць, калі яму так хочацца, — супакойвала Тамару суседка Вера. — Прачнецца, то шмат чаго не пазнае... Ох і цяжка яму будзе, пакуль засвоіць перамены, з глузду можна з'ехаць... Заснуў жа, калі за тры рублі паўмагазіна можна было скупіць, кіно — трыццаць капеек, а на трамваі ці аўтобусе за пятак хоць увесь горад аб'едзь!

— А марожанае? Дваццаць капеек!.. — летуценна дадала Тамара і ў голасе з'явілася дрыготка. — На электрычцы за некалькі рублікаў да Брэста можна было даехаць!

— Што казаць, — клопатна ўсчала суседка. — Каб у нашага Змітрука без шоку ўсё абышлося, трэба з ім, калі прачнецца, добра-такі папрацаваць. Будзем пільнаваць. Падрыхтуем... Увядзем паволі ў новыя абставіны.

Аднак лёс распарадзіўся па-свойму. Неяк каля абеду, гэтак жа раптоўна, як і праваліўся ў небыццё,

Змітрук расплюшчыў вочы, пацягнуўся, глянуў на гадзіннік і ўскочыў: «От, я столькі ўсяго напланаваў... З чаго пачынаць? Эх, пайду-ка я ў лазню. А пасля — і ўсё астатняе.

Вывучыўшы змесціва свайго партманэ, Змітрук на ўсякі выпадак пералічыў грошы. Іх было нямала: два чырвонцы, тры дваццацьпяткі, астатняе — так, дробязь. Можна было і піўком у лазні паласавацца, і ў кіно пабыць, яшчэ і ў краму схадзіць...

У лазні, калі ён працягнуў у акенца сваю дзесятку, касірка дзіўна глянула на яго, з’едліва пасміхнулася:

— Якія грошы вы мне даяце?!. З якой планеты да нас зваліліся, малады чалавек?.. Зайцоў давайце!

— Я не паляўнічы... Зайцоў у мяне няма, — яму аж грудзі распірала ад нечуванага нахабства з боку касіркі.

— Не прыкідвайцеся Хрыстафорам, вашы сцэны тут не да месца. А калі шчыра, дык зайцамі не абыдзецеся... Ногі толькі й можаце памыць. Хочаце як след выпарыцца, з венічкам, — зуброў ды ласёў давайце.

— Я вас не разумею... — Змітрук разгублена адышоў ад касы. «Хм, калі гэта яны перайшлі на натуральную аплату?.. Нібы ў каменным веку. Ат, схаджу-ка лепш да Марыны, у гастраном. Атаваруся, бо ў халадзільніку скразнякі гуляюць».

Марына аказалася на месцы, але на сябе, ранейшую, была мала чым падобная. Глянула на яго ажно нават пужліва неяк, з папрокам, і засаромелася. «Трэба ж, — падумаў Змітрук, — што гэта з дзеўкай робіцца? Халат адтапыраны на жываце, не сёння — заўтра дзіця народзіць. А здаецца ж, ці не ўчора яшчэ выглядала бярозкай стройнаю».

Падступіўся да касы, падаў чырвонец і, як звычайна, пачаў пералічваць свае харчовыя патрэбы: малако, масла, сыр...

— Вы што?!. — вырачыла вочы касірка. — Якое масла?.. Дзе ваша картка? А сыр дзе вы бачылі? Падкажыце, дык я зараз збегаю і сабе вазьму. Вось, плаціце за бутэльку малака. Ды не гэтымі, старымі грашыма. Падавайце зайцоў.

Касірка была новая, у акулярах. Вочы злосныя. Зміірук упершыню яе бачыў.

— Даліся вам гэтыя зайцы, — Змітруку хацелася вылаяцца матам. «Што з людзьмі стала? Нейкае пагалоўнае вар'яцтва. Калі б на двары быў не снежань, а красавік, то падумаў бы, што сёння дзень смеху. Бач, ім падавай зайцоў, ласёў, нават зубрамі не грэбуюць, а гэтыя жывёлы ў чырвоную кнігу занесены».

У глыбокай задуменнасці Змітрук выйшаў на вуліцу. Ішоў і не пазнаваў горада. Нават людзі нейкія не такія, як раней. Моладзь не такая. З заплечнікамі гойсае, на папругах — прадаўгаватыя шабеткі, падобныя на патранташы.

Спыніўся ля цырульні. Убачыў свой адлюстровак у шкляных дзвярах (выгляд нейкі неахайны, валасы — параздзіманы ветрам стог, пакамечаныя) і вырашыў: «Якраз сюды мне і трэба».

Седзячы ў крэсле, ён з асалодай прыслухоўваўся, як спрытна стракатала каля скроняў нажніцамі майстрыха, і задаволена сачыў, як паступова ахарошваўся і выступаў з люстэрка яго выразна памаладзелы твар.

— Фенам, адэкалонам? — прыемна прагучала над вухам.

— Рабіце, як у лепшых цырульнях Ландона! — узнёсла выгукнуў ён. — Каб прыгожа было і духмяна.

Майстрыха дастала з асобнай шафкі свежы накрахмалены рушнічок, змахнула асцюкі з твару і патыліцы, цярнула за вушамі. А Змітрук радаваўся аж млеў ад прыемнасцяў: «Бач, які сервіс... Калі такое было?»

Нарэшце яго падвялі, бы знакамітасць якую, да касы, дзе і была яму названа сума: восем тысяч трыста рублёў. Майстрыха стаяла ўбаку і любавалася ягонай прычоскай. Касірка прыязна ўсміхалася, пакуль не мільгнуў у яе перад носам чырвонец. Тут жа ўзвілася, бы ўджаленая пчалой:

— Вы што мне даяце?!. Што за нахабнасць, га?

— Дык што — вам таксама зайцамі? — паказаў сваю дасведчанасць Змітрук.

— А чым жа яшчэ? — Пагляд касіркі ўмомант пацяплеў. — Можна зялёненькімі... Тры. А не шкадуеце — пяць.

— Зялёных няма, — у лад ёй сказаў Змітрук. — А чырвоныя ёсць... Вось, дзесятка, без рэшты. І няхай вам, шаноўная, добра будзе.

Апошнія яго словы патанулі ў шуме і ляманце касіркі. Да агаломшанага Змітрука тут жа падпырхнула майстрыца і моцна ўхапіла яго за рукаў.

— Не ўцячэш! — І — да касіркі: — Валя, звані ў міліцыю... Мы яго навучым, як на халяву марафет наводзіць. Прахвост!.. А такім прадпрымальнікам прыкінуўся. Няўклюда... Дапатопны выкапень!

У чарапку Змітрука нешта закруцілася, загуло і замільгацела. Ён бразнуўся на падлогу, так і не ўцяміўшы, з-за чаго на яго няшчасную і, трэба сказаць, добра падстрыжаную галаву пасыпаліся такія праклёны.

«Хуткую» доўга чакаць не давялося. Пажылая дакторка не адразу пазнала Змітрука, але пазнала-

такі, бо не аднойчы даводзілася ёй падчас дзяжуртваў наведваць «соннага», каб далажыць пасля пра яго стан здароўя.

— Што з ім? — звяла далоні адна да адной касірка.

— Ой, доктар, ён ціхенька так лёг... І заціх. Жывы, га? Не памёр? — хвалявалася майстрыха. — Я ж так акуратна з ім, нідзе не шкрабнула нават.

Дакторка агледзела Змітрука і канстатавала:

— Падобна на летаргічны сон... Няшчасны чалавек. Зноў увесь медперсанал раёна паставіць на вушы.



# ІМЯ ТАБЕ — ЧАЛАВЕК

У Зоі Ізох нарадзіўся сынок. Акушэрка ўзяла хлопчыка на рукі, падняла ўгору, усміхнулася весела:

— Чалавек нарадзіўся!

Дакторка агледзела дзіцяці й загадала:

— Аднясіце нованароджанага ў палату.

З таго часу Рыгор Ізох ( так назвалі хлопчыка) неяк неўпрыкмет перастаў быць проста чалавекам. З нованароджанага ён ператварыўся ў немаўля, потым — у дзетсадаўца, пасля — у першакласніка.

— Вучань Ізох, ідзі да дошкі, — чуў ён ажно адзінаццаць гадоў запар.

— Студэнт Ізох, вашу заліковую кніжку! — патрабаваў выкладчык у інстытуце.

І далей — кім толькі ён не быў гэты самы Рыгор Ізох : то пешаходам, то пасажырам, то хворым, то кліентам...

— Паважаны глядач, — ветліва звярталася да яго дыктарка з тэлебачання і хітравата ўсміхалася.

— Дарагі слухач, — неслася з рэпрадуктара.

— Пакупнік, дайце дробныя грошы, у мяне няма чым з вамі ралічыцца.

— Мужчына, вы тут выходзіце? — штурхала яго ў спіну маладзіца ў трамваі.

— Інжынер Ізох, вы не здалі ваш квартальны план, — каторы раз нагадваў яму загадчык аддзела.

— Абанент 325, вазьміце заказаную кнігу, — звярталася да яго бібліятэкарка.

— Бацька, а не пара табе падумаць аб машыне, у мяне ўжо правы ёсць, — вельмі празрыста хіліў да свайго сын.

— Татуля, маё футра знасілася, трэба — новае, — лашчылася дачка.

— Дзядуля, купі цукерак, — енчыла ўнучка.

...Кім толькі не даводзілася быць Рыгору Ізоху за сваё доўгае жыццё: мужам, зяцем, дзедам, шваграм, свёкрам, цесцем... І адно ніколі не быў ён чалавекам. Ды за гэтай штодзённай мітуснёй і мільготным калаўротам дзён дарэшты забыўся ён пра сваю чалавечую годнасць. Заўсёды згодна ківаў, падтакваў, пагаджаўся, адгукаўся на кліента і пацыента, жыхара і старога, наведвальніка і адпачываючага, лагодна пасміхаўся, саромеючыся прасіў.

«Жыць шкодна, — сказаў паэт. — Ад гэтага паміраюць». З такое нагоды завяршыў свой жыццёвы шлях і Рыгор Ізох. Колькі ласкавых і ўсхваляваных слоў безадказна стукаліся ў яго труну і завісалі ў паветры. Ва ўспамінах блізкіх і знаёмых ён быў шчыры й добры бацька і дзядуля, паважаны інжынер і выдатны сябра.

— Каго хаваюць? — ківаючы на свежавырытую яму, спытала жанчына, якая толькі што падышла да засмучанай купкі людзей — родзічаў і знаёмых нябожчыка.

— Чалавека!..

— Добры быў чалавек!



# ДАРАГІЯ, ПЯШЧОТНЫЯ, МІЛЫЯ...

Нягеглы мужычок, гадоў так пад семдзесят, трымаючы ў руцэ недапітую пляшку з півам, стаяў у магазіне пасярэдзіне залы й час ад часу са смакам пацягваў з яе. Узлахмачаны, у задрыпаным пінжачку, з планкай медалёў на левай грудзіне, ён яўна выдаваў сябе на трыбуне нейкага сходу, бо зычліва, пранікнёна глухаватым голасам гаварыў:

— Мае вы шаноўныя жанчынкі! Цяпер вось, напярэдадні вашага свята я вас віншую. І шкадую вас, мае вы дарагія. Так, мне ўсіх вас шкада. Я дарыў бы вам кветкі, цукеркі, але дзе ўзяць мне столькі грошай?.. Ніхто вас не кахае, не песціць. Стаяце вы ў чарзе па масла... За кавалкам мяса такі натоўп... Бедныя вы, бедныя. Што я магу зрабіць для вас?

— Сціхнуць!.. — гукнула з чаргі чарнявая маладзіца.

— Пашкадаваў воўк кабылу — пакінуў хвост ды грыву, — стрэльнула прымаўкай суседка чарнявай, троху старэйшая па гадах, але па ўсім відаць, што па слова ў кішэню не лазіць.

Дзед-выступака нават і вухам не павёў, цягнуў сваю песню:

— Мае вы любыя, гаротныя, за што вас так Бог карае, га?.. Навошта вам такая камедыя жыцця, га?

Прыгорблена-цыбатая бабуля выцерла кончыкам хусцінкі слязу, кабеціна ў стракатай хусціне крыва ўхмыльнулася, а мужчына ў капелюшы набычыўся і згодліва пакіўваў галавою, прыгаворваючы:

— Гэтак усё, гэтак...

Нечакана сакавіта-гучна і патрабавальна азвалася касірка з той самай касы, што ля акна:

— Дзед!.. Галава ад цябе баліць, змоўкні!

Але стары прамоўца як і не чуў у свой адрас папрокаў, па-ранейшаму глухавата бубніў:

— Ах, мае вы любыя, мае пяшчотныя!.. Я абсыпаў бы вас ружамі, надарыў бы ўсяго-ўсенькага, але каб меў на тое грошы... Вы ўсе тут сталі б падобныя на ангельскую каралеву.

— Менш піць трэба — і будуць грошы, — пачулася ад касы, што на сярэдзіне залы. — І на ружы хапіла б... А так — ні руж, ні рамонкаў, адны шыпы.

Дзядуля не рэагаваў, гнуў сваё:

— Вы, бабанькі, — кветкі жыцця... І такія ўсе прыгожыя, рахманыя. А жытка вас курочыць, нявечыць... Гаротніцы, таўчэцеся ў бясконцых чэргах, з цяжкімі торбамі грабецеся дахаты, а там — ля пліты ўвесь вечар...

— Дзед!.. — загрымела прадавец з бакалейнага аддзела. — У мяне ад тваіх песень сэрца забалела... Завёўся, як той грамафон.

— Ото ж, праўда, — падтрымала прадаўшчыца з мяснога. — Лямантуе гадзіну і ніхто ж яго не супакоіць... Няма на яго ўправы. Заткніце хто яму рот, мне тут думаць трэба... Саб'юся ў падліках — недастача будзе.

Дзядок не сыходзіў з ранейшага месца і, здаецца, нават не ўсведамляў, што ўвесь гэты галас выкліканы яго шчырым клопатам пра жаночую долю.

З бакалейнага аддзела прагучаў цэлы каскад непрыстойнасці:

— Што за брыдота вылупляецца там, га?!. Вар'ят стары, завёў сваю катрынку... Зараз я выйду, чуеш? Праганю к чорту!

Дзядок павярнуўся спінаю да «бакалейшчыцы», глядзеў у акно і, пэўна, бачыў недзе там нейкі свой светлы вобраз, бо не зважаў на пагрозу, казаў далей:

— Ах, вы мілыя-любыя, хто ж гэта вас так пакрыўдзіў? Колькі ж гора лягло на вашы плечы — ніхто не шкадуе вас... А вы ўсё — самі, самі... У плуг і ў барану ўпрагаліся, цягнулі, а сёння вам і дзякуй ніхто не кажа...

Зноў «бакалейшчыца» падала голас:

— Мужчыны, ды выведзіце гэтага агідніка, працаваць не дае... Быдта радыё — не змаўкае, цягне ўсё і цягне на адной ноце.

Дзядуля працягваў лагодна пасміхацца. Вочы яго слязіліся. Ён не пераставаў усхваляць ды шкадаваць жанок, пакуль мацак-мужчына з чаргі не падышоў да яго і даволі недалікатна выставіў парушальніка цішыні за дзверы.

У магазіне доўга яшчэ стаялі гамана і лямант, чулася абурэнне з нагоды прыкрых паводзін нейкага бязглуздага хулігана.



# ЗВЫЧАЙНЫЯ ПРЫГОДЫ АВЯР'ЯНА ЦЭДЗІКА

## *Нетарыфная стрыжка*

Калі Авяр'ян Цэдзік, рахункавод калгаса, прыязджаў у горад па справах службовых, дык адначасова вырашаў і свае праблемы асабістыя. Вось і сёння мусіў зайсці ў сталічную цырульню. І не проста зайсці, каб пагрэцца або адпачыць, ды заадно паглядзець 1348 серыю «Санта Барбары», хаця і гэта не зашкодзіла б. На вуліцы гуляла завіруха, мароз хапаў за вушы, а яшчэ — правы чобат непрыемна муляў. У цырульні, пакуль будуць стрыгчы, можна і пагрэцца, і адпачыць. Валасоў тых на Авяр'янавай галаве — кот наплакаў, небагата. Сусед, аднагодак ягоны, калі троху падвып'е і адчувае, што яшчэ столькі можа кульнуць, звычайна ідзе да Авяр'яна і, назола, пачынае даймаць: маўляў, варта, Аверка, глянуць на цябе — і адразу відаць, што чалавек ты з вялікай эрудыцыяй, і доказ гэтаму — твой дачасна лысеючы чарапок, бо разумная галава з дурным валоссем не доўга ведаецца. Рахункавод Авяр'ян Цэдзік старанны, грошы атрымлівае неблагія, і не было такога выпадку, каб сусед вяртаўся ад яго, як кажуць, не солана хлябаўшы. Якраз і хлябне ўволю, і закусіць. Але ж чупрына Авяр'янава, як бы сусед ні жартаваў, ані не гусцее. І што — валасы неўпрыкмет збеглі: спачатку зверху і сперадзе, ад

чаго на скронях і патыліцы з'явіўся няўклюдна пакручаста-пуховы венчык, нібы ў дзьмухаўца пасля цвіцення. Асабліва, калі глядзець з вышыні. Дык вось гэты самы венчык і турбаваў Авяр'яна ў першую чаргу: каб не яршыўся ва ўсе бакі, яго трэба своечасова прыстойна абчасаць. Пасада вымагала — як-ніяк, Авяр'ян Цэдзік вясковы інтэлігент.

Зайшоў-такі ў цырульню. Сеў у першае крэсла. Да яго тут жа падступілася дзябёлая маладзіца з чырвоным бантам у рыжых кучарах, спытала:

— Як будзем стрыгчыся?

— Ну, падраўняць, зняць лішняе...

— У нашым прэйскуранце такой стрыжкі няма.

— А што ёсць? — нясмела спытаў Авяр'ян.

— «Вецярок», «пад польку», «паўбокс», «бокс», «маладзёжная», «канадка»...

— Во! Давайце пад гэтую самую — я не ачуўся? — кадку.

— Ачуліся... — Майстрыца пасміхнулася, але не стала папраўляць Авяр'яна, бо ў яе абавязкі такое не ўваходзіла, затое яна з добрым веданнем справы спачатку нечым пырскнула яму на скроні й патыліцу і тут жа ўсчала з такой хуткасцю ляскаць нажніцамі, што Авяр'ян не на жарт занепакоіўся за свае вушы.

Не быў ён у цырульні бадай гадоў недзе з дваццаць. З яго лахманамі звычайна добра спраўлялася Стэфа, але яна ўжо больш за месяц гасцюе ў Ташкенце, у сына: нявестка пайшла на працу, дык Стэфа цяпер там у іх за няньку — пестуе ўнучку.

Нечакана над галавой нешта зачмыхала, загуло — стала дзьмуць, і не холадам, а цяплом. Авяр'ян міжволі прыжмурыў вочы, а далей ужо і не чуў гуду-свісту, бо задрамаў. Змірсцілася, што ўзлаваная

Стэфа, замест таго, каб выпіць, выліла яму за каўнер паўнюткую чарку руска-горкай. Ён тузануўся і адкрыў вочы. Пахла спіртам. Майстрыца паставіла «пшыкаўку» на столік, прыязна прабуркавала:

— Усё... З вас — восем тысяч семсот дваццаць пяць рублёў.

— Як гэта?.. — спытаў Авяр'ян замест таго, каб падняцца і прайсці да касы. — За адну стрыжку такая сума?

— Стрыгла вас пад «канадку», як і пажадалі.

— Але ж у мяне паловы валасоў няма, то і аплата мусіць быць адпаведная.

— Ну, гэта вы скажаце сваёй жонцы. А ў нас — тарыф. Я не маю права браць ні меней, ні болей.

— Як гэта — не маеце?.. Вы ж абрабілі толькі скроні й патыліцу, а ўся астатняя прастора ў мяне голая.

— Затое адэкалонам вам шыю, лічыце, памыла, уцірка чыстая была, а гляньце — чорнай стала, — махнула перад вачмі Авяр'яна сапраўды даволі брудным кавалкам рушніка. — А фен?.. Давялося сушыць вам увесь плеш, бо ад поту блішчэў, як мокры гарбуз... Выбачайце, я з нічога зрабіла добрую прычоску. А вы... Як ураслі ў крэсла. Пагляньце, вас касірка чакае!

— Хм, калі чакае... Што ж, хай будзе па-вашаму.

## *Абед на дваіх*

Да адпраўлення электрычкі заставалася амаль тры гадзіны, і Авяр'ян Цэдзік — голад не цётка — вырашыў зазірнуць у бліжэйшую сталоўку. У кішэні

нешта засталося з грошай пасля наведвання розных крамаў — тое-сёе прыдбаў, не з пустымі ж рукамі вяртацца дадому.

Чарга ў сталоўцы, ля раздачы, як хвост у казла, не надта вялікая. Узяў паднос, паставіў на яго судок з баршчом, талерку з катлетай і макаронай, кампот у гранёнай шклянцы, хлеба пару кавалкаў. Выбраў якраз ля акна свабодны столік, выставіў на яго стравы, павесіў цяжкую сумку на спінку разгайтанага крэсельца, а паднос, каб не замінаў, аднёс і пакінуў на брыжы акенца з надпісам: «Брудны посуд». Падумаў, што няблага б рукі памыць, але не было дзе, і ён пашыбаваў да свайго століка. Ї тое, што ўбачыў, бадай ледзь не скруціла чалавека ў барановы рог: яго боршч сёрбаў, ляскаючы лыжкаю, не проста звычайны чалавек, па нашым меркаванні, а іншаземец, больш дакладней — негр.

«Эйш, занесла яго нялёгкая за мой стол... Спакусіўся на чужы абед. — Авяр'ян так быў уражаны, што гаварыць нічога не мог, адно стаяў і глядзеў, як туд-сюд рухалася лыжка. Негр нават і вокам не павёў, быццам гэта ў іх звычайная справа чужымі прысмакамі ласавацца. — А мо ён па няведанні такое ўчыніў? Стол накрыты, абед на стале... Чхаў ён на самаабслугоўванне: паесці, кіне даляр — і пайшоў! Ды мяне гэтым, чорны чалавек, не возьмеш — няма дурняў...» — Авяр'ян прысеў побач з неграм і рашуча пасунуў да сябе талерку з катлетай і макаронаю.

Негр бліснуў на яго лупата-чорнымі зенкамі, узяў чарговы кавалак хлеба, адкусіў і зноў стаў працаваць лыжкаю.

«Ах, ты!.. Бач, нахаба які, бессаромнік, — як не шыпеў Авяр'ян, яго аж калаціла ад крыўды. Прагна глытаючы даўкія макароны, ён з гэткай жа прагай стаў есці й катлету. Толькі пацягнууся рукой да шклянкі з кампотам, як негр хапіў яе і тут жа троху адпіў. — Такіх вось і лінчуюць... Ї ў турмы содзяць. Як гэта назваць — нахабства, злачынства нават! — Авяр'ян гатовы быў выбіць кампот з рукі негра, які тым часам нечага зазірнуў у шклянку і тут жа адставіў яе ўбок. — Ах, срэбнай лыжачкі няма, нечым дастаць сушаны яблычак?.. — раптам зарадаваўся Авяр'ян. — Тут табе не там — без лыжачкі абыдзешся, бо нават алюмініевай, гнутай-перагнутай, са свечкай не знойдзеш...»

Негр дастаў з кішэні надзіва белую хусцінку, старанна абцёр ёй краі шклянкі, з жалем паглядзеў на Авяр'яна і пасунуў яму свае недапіўкі. Счакаўшы, на ломанай рускай мове спытаў:

— Вы, гражданын, будьете бомж?

Авяр'ян не знайшоўся, што адказаць, затое ў думках — гарэў полымем: «Ах, ёлупень!.. Аб'еў, абабраў, як ліпку, і во — шкадуе, дабрадзей. Абражае... Быў бы ты не чужак, то я паказаў бы табе, дзе ракі зімуюць!»

Негр апусціў сваю белую хусцінку ў судок ад баршчу, падняўся і пакінуў сталоўку.

Авяр'ян затрывожыўся раптам — сумкі ягонай не было там, дзе пакінуў. «Вось табе і паеў... Абакраў афрыканец!» Падхапіўся, абабег вакол століка, азірнуўся... і ўбачыў сваю чорную, біткам набітую пакункамі, сумку. Яна вісела на спінцы нягеглага крэсельца, што стаяла пры суседнім стале, на якім

астываў нечапаны абед: такі ж самы вушасты судок з баршчом, алюмініевая талерка з катлетай і макаронамі, гранёная шклянка з кампотам, а споверх яе — тры кавалачкі хлеба...

## *Паўдзённы злодзей*

Ёсць людзі відавочна няўдалыя, такія, якім заўсёды не шанцуе. Калі яны спяшаюцца, то перад імі адыходзіць апошні аўтобус, у чарзе перад імі якраз заканчваецца танныя каўбаса альбо сыр, у кіно — апошні білет. А калі давядзецца ўпасці з даху ледзяшу ці чарапіцы, то абавязкова — нябогу на голаў. Калі хтосьці кіне на тратуар бананавую корку, дык паслізнецца на ёй менавіта вядомы ўсім нешчаслівец.

Такое нешанцаванне, нібы заразлівая хвароба: з кім павядзешся, ад таго і набярэшся. Калі табе твой сябрук увесь час енчыць, як яму ні ў чым не шанцуе, то няйнакш яго ўся пошасць пяройдзе на цябе. І тады ўжо ты цягнеш мулкую лямку нешчасліўца.

Вось такім якраз і быў сябрук Авяр'яна па кааператыўным тэхнікуме Лявон Грыбок. Недзе з пятнаццаці гадоў за ім трывала ўмацавалася слава нешчасліўца. З ім заўсёды адбываліся нейкія недарэчнасці: спазняўся амаль на ўсе «пары», хаця інтэрнат быў побач з вучэбным корпусам, часта падаў, наступіўшы на шнурок ад уласнага чаравіка, бадай кожны палец на яго руках быў некалі прышчэмлены дзвярыма, а ступакі ног — абвараныя кіпнем. Усяго не пералічаш.

Трэба ж, недзе гадзіну назад Авяр'ян даведаўся, што Лявон ужо другі месяц ляжыць са зламанай нагой, якую яму то гіпсуюць, то зноў ламаюць і гіпсуюць. О, гаротнік, як толькі й церпіць такое... Авяр'ян даўно рваўся ў горад, спраў сабралася шмат. Сказаў жонцы пра Лявона, і яна не запярэчыла — едзь, адведай сябра. Сабрала таго-сяго з вясковых гасцінцаў — яблыкі, часнок, каўбаска. У горадзе ўсё гэта можна толькі купіць, а тут — сваё, якаснае.

Недзе каля адзінацаці гадзін раніцы Авяр'ян знайшоў патрэбны яму дом на ўскраіне і толькі сабраўся адчыніць дзверы пад'езда, як тыя самі знянацку так хвостка джвігнулі яму па правым надброўі, што з вока — аняго ж! — вылецеў яркі сноп іскраў. Левым вокам Авяр'ян убачыў-такі дзецюка з бульдогам, якія лётма пратупацелі міма. Маглі б і з ног збіць, каб яго не адвіхнула дзвярыма ўбок.

Авяр'ян раззлаваўся і, паціраючы даланёй пабітае месца, вылаяўся: «Сабачнікі чортавы! — Счакаўшы, прабубніў сабе пад нос: — І сапраўды, не ведаеш, дзе ўпадзеш. Не інакш — ліхтар над вокам засвеціць, потым вытлумачвай, хто так расфарбаваў...»

Лявон сустрэў земляка, лежачы на канапе. Пакутнік, абкладзены газетамі й часопісамі, быў цалкам зацыклены на сваёй хваробе. Гутарка ніяк не атрымлівалася. Пакуль пілі гарбату з мёдам, што прывёз Авяр'ян, Лявон збольшага расказаў пра яміну, у якой ён апынуўся, і нават боль не адразу адчуў, думаў, вышкрабецца і пойдзе, аж — не, заштапарыўся, сеў на якар. Лявон з недаверам пaглядаў на Авяр'янава надброўе, падвяргаючы сумненню версію з дзвярыма.

Апоўдні развіталіся. Авяр'ян пашыбаваў на аўтобусны прыпынак, дзе, як ні дзіўна, апынуўся ў адзіноце. На так-сяк заасфальтаванай пляцоўцы не было ні лавы, каб прысесці, ні хоць бы якой паветкі, каб схавацца ад ветру, што працінаў ажно да касцей. Давялося рухацца — туды-сюды соўгаўся, пазіраючы з надзеяй на скрыжаванне, адкуль з-за гастранома мусіць з'явіцца такі жаданы й наўздзіў капрызны сродак перамяшчэння — аўтобус.

Мінула пяць хвілін, дзесяць... Стрэлка наручнага гадзінніка адлічыла ўсе трыццаць хвілін, аднак аўтобуса не было. Авяр'ян з сумам і жалем падлічваў, што мог бы ён зрабіць за гэтыя марна патрачаныя паўгадзіны. Нечакана яго ўвагу прыцягнуў мужчына ў капелюшы й плашчы, з двума габарытнымі чамаданамі. Мужчыну было недзе гадоў за сорак, і бег ён даволі шпарка, ва ўсякім разе — намагаўся так бегчы. Праўда, ужо здалёк відаць было, што даецца гэта яму з вялікай цяжкасцю. Капялюш з'ехаў набок, кашнэ на шыі развявалася, бы сцяг, чамаданы нязграбна білі па нагах, але чалавек усё ж такі бег, нечага раз-пораз азіраючыся. І вось — з-за вугла гастранома выхапілася двое міліцыянтаў: дубічылі, па ўсім відаць, следам, даганялі.

«Злодзей, — падумаў Авяр'ян. — Канешне, злодзей... Паўдзённы! Як пішуць у кнігах, паказваюць у кіно... Ды цяпер — акурат іх час. Гм, першы раз такое бачу... Во, стану як бы ўдзельнікам затрымання. А як жа — міліцыянтам трэба памагчы!.. Не надта малады зладзюга, бач, у капелюшы, прыстойна апранены (мусіць, для канспірацыі), чамаданы фірменныя... Эйш, напакаваў — як узяць. І бяжыць —

не баіцца інфаркту, натрэніраваны. Але ж і міліцыя не спіць у шапку — высачылі-такі малойца, сядзе...»

Ад гэтай згадкі Авяр'яну стала не па сабе. У мінулым годзе ён ляжаў у бальніцы з сэрцам, і словы доктара запалі ў памяць. «Экскулап-сардэчнік» распавядаў пра вакзал, перон, хуткі цягнік і чамаданы. Недзе так гаварыў: «Калі ў цябе ў руках два чамаданы, а цягнік крануўся і ты яго дагоніш — значыцца, здароўе адметнае. А спынішся, пачнеш за сэрца хапацца — ведай: сасуды твае ўжо не надта, трэба пачынаць лячыцца».

Тым часам злодзей набліжаўся да Авяр'яна, раз-пораз азіраючыся. Міліцыянты бадай што дыхалі яму ў патыліцу — вось-вось насцігнуць і схопяць. Авяр'ян стоена пасміхнуўся: «Зараз будзе табе навар — атрымаеш прыбытак, аж гэдак гадкоў пяць...» І тут якраз выпхнуўся з-за вугла гастранома жаданы аўтобус, перагружаны так, ажно яго скасабочыла. Авяр'ян быў захваляваўся, бо можа і не спыніцца гэтае цуда стагоддзя. Не, прытармазіў-такі на прыпынку. Ніхто не выходзіў, і мужчына з чамаданамі памкнуўся пранікнуць у салон аўтобуса праз пярэднія дзверы. Авяр'ян захваляваўся: «Уцячэ... Дальбог, уцячэ. — Усумніўся ў спрыце міліцыянтаў. — Хоць і трое іх, а могуць упусціць, разявы...» А злодзей — тут як тут, ля задніх дзвярэй не затрымаўся, і Авяр'ян хуценька выставіў наперад яму свой ялавы чобат, густа наквэцаны ваксай, бліпчасты. Усё атрымалася, як і хацеў, — акурат пад рыфлёную падэшву правага чаравіка патрапіў, умомант спыніў уцекача. Не, той не проста спатыкнуўся — недзе метры з два тырчком праляцеў наперад, але чамаданы свае не пагубляў. Вопытны, умее падаць.

Авяр'ян з гонарам павярнуўся да міліцыянтаў, якія толькі што падбеглі да аўтобуса, і сабраўся ўжо выслухаць словы падзякі, як тых і след прастыў — у мірг вока зніклі ў чэраве аўтобуса.

Тым часам чалавек у капелюшы, злосна лаячыся, падняўся і пайшоў у наступ на Авяр'яна:

— Што за жарты, га?!. — Блізка падступіўся, гатовы ўхапіць Авяр'яна за горла, грымеў яму ў твар: — У вас што — з галавой не ўсё ў парадку?!. Не ўсе дома, так?.. От я зараз троху падпраўлю ваш розум!.. — Голас мужчыны зрываўся і дрыжаў. — З-за вас я на цягнік спазніўся! — Твар яго знячэўку хіжа перасмыкнуўся, збялеў, і ў гэты момант кашчавы кулак моцна прыпячатаўся пад левае вока Авяр'яна, ад чаго ў галаве грамадскага затрымальніка нешта раптам гайданулася і пайшло кружляцца і скрыпець, як усё роўна вятрак запрацаваў пад чарапной каробкай.

Авяр'ян ледзьве ўтрымаўся на нагах, яго пахіствала ўбакі. Зніякавела-абражаны, ён як не ў роспачы падумаў: «Нешанцаванне — сапраўды хвароба заразлівая... Гэта ж, у адзін дзень зарабіў ажно два высветкі на свой твар... Няўжо Лявонавы беды на сябе ўзваліў? Божа, гэта ж цяпер куды не паткнуся, а чорт — тут як тут, гара б яго расплюскала!»

## *Хіба гэта лішкі?*

Самалёт адлятаў праз паўтары гадзіны. Авяр'ян — чалавек дакладны, пунктуальны, стаяў у чарзе да акна № 3, каб здаць багаж. Ляцеў ён з Ташкента, ад сына, таму прыхапіў з сабой розных

прысмакаў, якіх не было ў яго краях: курагі, разынкаў, дыньку ды іншай духмянай садавіны. Па правілах, дваццаць кілаграмаў можна везці задарма, то чаму ж не ўзяць гасцінцаў з поўдня? Чарга рухалася памалу, праўда, яго вельмі раздражняў нейкі дзяцюк — стаяў якраз перад Авяр'янам, цепаў плячыма, часта сморкаўся ў шэрую насоўку. Мажны, высокі. Абцягнутая камізэлькай шырокая спіна і тое, што было ніжэй, нагадвала бадай ці не дзеючы вулкан.

Спартыўны й падцягнуты Авяр'ян са спачуваннем глядзеў на нязграбна-тлустую постаць бамбізы, які да ўсяго яшчэ і шумна ўздыхаў, выціраючы лоб усё той жа насоўкай.

Нарэшце дайшлі да вагаў. Атрымаўшы свае жэтоны, дзяцюк даволі порстка пасунуўся да выхаду на пасадку.

— А ў вас — тры кіло лішку, — паведаміла Авяр'яну дзяўчына, якая абслугоўвала вагі. — Плаціце ў касу.

Авяр'ян мітнуўся да суседняга акенца, сказаў пра даплату трох кіло, як тут жа пачуў прыемны галасок касіркі:

— З вас — тры тысячы.

— Тры тысячы?.. — не ўцяміў Авяр'ян. — За што?

— За тры кілаграмы лішняй паклажы, — ахвотна растлумачыла касірка. — Калі кожны возьме з сабой больш нормы, то самалёт і з месца не скранецца.

— Хм... Я, дапусцім, з усімі сваімі вандзэлкамі меней за шэсць пудоў заважу, а вось перада мной бэйбух здаваў свой багаж, дык ён сам на ўсе дзесяць пудоў пацягне... А яго, бач, адпусцілі без даплаты. Гэта несправядліва!

Касірка пыхліва надзьмулася і патлумачыла:

— Ну, на гэты конт скардзіцеся ўладам... Мы законы не пішам і пасажыраў не ўзважваем. А за лішні багаж — плаціце, калі ласка!

— Не ўзважваеце, а дарма! — кінуў у адказ Авяр'ян Цэдзік і працягнуў у акенца патрэбную суму грошай.

## *Задача*

Нарадзіўся ў Авяр'яна ўнук. Радасць для ўсіх. Хлопец хоць куды! Усе параметры — як па кніжцы: і рост належны, і вага.

— Будзеце сачыць за развіццём дзіцяці, — давала парады маладой маці доктарка. — Кожны месяц немаўля трэба ўзважваць — важна ведаць, як яно набірае масу. Ад гэтага многае залежыць.

І праз месяц, заклапочаныя здароўем дзіцяці, бацькі пашыбавалі ў паліклініку. Вядома ж, Авяр'ян таксама быў разам з імі.

І што ж атрымалася? Медсястра з болем у голасе раптам паведамляе:

— Ой, што рабіць?.. У нас ужо тры тыдні, як дзіцячыя вагі зламаліся, а новыя яшчэ не атрымалі.

Дачка як не плача, кажа бацьку:

— Тата, прыдумай што-небудзь... Неяк жа трэба даведацца, як у яго з гэтай самай масай: набірае ці не... Што рабіць?

Медсястра кінулася суцяшаць маладую маці:

— Вы дарма сюды малога прынеслі — можна і дома ўзважваць, на звычайных хатніх вагах... Такіх, што да шасці кг паказваюць. Ён у вас яшчэ шасці не набраў.

— Няма ў нас такіх вагаў, — дачка глядзіць на бацьку свайго, Авяр'яна.

Той матнуў галавой і выдаў:

— Бязмен ёсць... Магу ўзважыць. А што? Дакладна ўзважу, з грамамі.

— Не, тата... — збянтэжылася дачка. — Бязменам не трэба.

Медсястра зноў уставіла свае тры грошы:

— У нас для дарослых ёсць вагі, але ж на іх дзіця не пакладзеш.

Авяр'яна аж падкінула:

— А мы яго паставім!

— Што ты, бацька?!. — дачка заклапочана зіркнула на Авяр'яна. — Тут жа кожная грамулька мае сэнс...

— Ты во што, дзеўка: трэба старэйшых слухацца, — цвёрда сказаў Авяр'ян. — Зробім так. Спачатку ўзважваем цябе з дзіцем, потым — цябе адну... А там — простае арыфметычнае дзеянне: ад першай атрыманай лічбы адымем другую... Атрымаем вагу майго ўнучака. Так?

— Ой, дзякуй вам!.. — зарадавалася медсястра. — Такая простая задачка, а для нас — выйсце... Як гэта мы самі да гэтага не дадумаліся?



## НЕПЕРАМОЖНЫ

Не, гэта была не вайна. Хаця ахвяр было мноства.

Гэта быў не землятрус, не паводка і не смерч.

Гэта было значна горш!

Смерч праносіцца за колькі хвілін. Землятрус у Спітаку працягваўся ўсяго паўхвіліны, а гэты зладзей лютуе ўжо як не трэці месяц і, здаецца, ад яго ніякага ратунку няма і не будзе...

Што і казаць — гэта нават і не эпідэмія грыпу, якая звычайна хапае людзей у свае абдымкі менавіта падчас яго каварнай дзейнасці. Калі хто думае, што гэта моцны мароз альбо лівень, таксама моцна памыляецца.

Вы ж пабачце: надвор'е зусім, як кажуць, камфортнае, дарма што і зіма. Тэмпературны слупок, быццам тыя арэлі, гойдаецца то ўверх, то ўніз ад нулявой паметкі, але нашаму нахабніку ўсе гэтыя ваганні толькі на руку. І не дзіва — навокал творыцца нешта неймавернае, брыдкое і жорсткае...

Так, ён не ведае літасці! Нявечыць людзей незалежна ад узросту, полу, сацыяльнага ці якога іншага становішча. Перапужаныя да смерці гарадчукі й вяскоўцы, баяцца выйсці з хаты, а калі куды хто і выпраўляецца — ад страху ды маркоты таго пры кожным кроку кідае ў жах. На душы змрочныя прадчуванні, здаецца, што не сёння — заўтра здарыцца непазбежнае... А не з ім, дык з яго братам, сватам, бацькам, на благі канец, з мужам альбо суседам.

Страшэнны монстр з такой мілагучнай і гладкай, як гумавая жуйка, назвай, застае якраз там, дзе яго не чакаеш, і ўмомант пакалечыць — надоўга ўкладзе ў бальнічны ложак. Як настае ягоны час, то ўжо нікому спакою няма: з вуліц проста знікаюць прыгожыя, стройныя модніцы, доўганогія какетлівыя маладзіцы, самаўпэўненыя мужчыны... Замест іх поўзаюць па тратуарах, затраўлена азіраючыся, засмучана павесіўшы галовы й дзіўна ўзмахваючы час ад часу рукамі, шэрыя, нязграбныя істоты, фатальна гатовыя ў любы момант прыняць на сябе жорсткі ўдар...

У вялікіх і малых калектывах кожны працоўны дзень пачынаецца з пераліку страт. На фабрыцы па вырабу цукерак, скажам, такая размова адбылася:

— Чулі, учора наш Мультан пагарэў?.. А пахваляўся, бахвал, што ўсё яму — да лямпачкі, што ён дужы й спартыўны. Бачыце, хоць і спартсмен, а ўхіліцца парзы не ў яго сілах — не ўцёк, не адмахаўся.

— А Ірачкі Сыркінай ужо трэці дзень не відаць...

— Дык жа злодзей гэты, пачвара, і яе не пашкадаваў... Папярэджвалі дзеўку, казалі: будзь асцярожнай, апранайся прасцей, дык не паслухалася. І вось — шпіталізавалі, шкада дурніцу маладзенькую.

— Ну, дзе ж ад гэтага чорта на высокіх абцасах уцячэш?.. Я, напрыклад, усё старое на сябе напяльваю, абутак стаптаны — маці родная не пазнала б... І ўсё роўна ўчора ледзь упільнавалася, — лепатала першая прыгажуня цэху Грэта.

Больш за ўсіх лямантавала вахцёрка — жанчына няпэўнага ўзросту і неабсяжных памераў з тоўстымі нягнуткімі нагамі:

— Вам, дзеўкі, не страшна, калі што, і ў яго абдымкі патрапіць — маладое не старое... А мне — ох, бяда: заваліць, то й зайдуся ад страху, не прыпаўзу дахаты.

— Міканораўна, а чаго вам, уласна, баяцца? — расплыўся коўзкай, як лёд, усмешкаю хударлявы электрык Фронькін. — Яму ж, гэтаму блакітнаму монстру, да вас не дабрацца... Такая цеплаізаляцыя, га?!

— А я, галубок ты мой, не за лытку сваю, а за галаву баюся, — калыхнула пульхнымі грудзьмі вахцёрка. — Раптам чарапок праломіць — ён жа без ізаляцыі.

...Горад стагнаў, пакутаваў, хаваўся, войкаў. Усе бачылі монстра, ведалі ў твар. Пра яго пісалі газеты, гаварылі па радыё. Яго паказвалі па тэлебачанні. А ён — быў ён, рабіў сваю чорную справу. З ім змагаліся, нават той-сёй катэгарычна заяўляў:

— Няўжо не можам даць яму рады?!. Чаму бяздзейнічаюць нашы сілавікі? Павінны ж быць нейкія сродкі барацьбы з гэтым нахабным разбойнікам!

Больш ціхія і меланхалічныя ўспрымалі яго як няўмольны лёс:

— Мусіць, так Богу патрэбна!

— Гэта нам за грахі нашы такая кара...

— Трэба цярпець — усіх не згубіць!

— Не, не!.. — шумелі былыя партыйныя дзеячы. — Пры нас такой брыдоты не было... Мы змагаліся. Па-першае, быў загад, былі талковыя інструкцыі. Па-другое, мы не ведалі такой, як сёння, спагадлівасці: ах, нехта недзе некага пакалечыў!.. У нас было ўсё

па-чалавечы проста: не лезь туды, дзе небяспечна. Палез — лячыся за свой кошт!

А між тым — непераможны й нястрымны *Галалёд* працягваў даймаць свае шматлікія ахвяры — ламаў ім косці ног і рук, рэбры... І не здаваўся. Самая вялікая надзея была толькі на прыход вясны!



## ПРАШУ СЛОВА!

Шаноўныя спадары й спадарыні, таварышы й таварышкі! Вось-вось мы скочым з года Сабакі ў год, выбачайце, Свінні. Спадзяюся, што ўсе дружна паселі вакол святочнага стала. Усе?!. Прыбраныя, узбуджаныя, у жанчын вочы блішчаць, ад прычосак вачэй не адвесці (і калі паспелі?!), дый мужчыны сям-там ёсць. Яшчэ не спяць, нават некаторыя пры гальштуках...

Я, праўда, не зусім разумею, чаго вы чакаеце, чаму вы радуецеся? Нас усіх, здаецца, проста ашукваюць, а калі дакладней — абдурваюць. Прызнацца, я даволі прынцыповая й прамая, як перпендыкуляр, і люблю ва ўсім парадак. Чаго гэта толькі стрэлкі марудзяць, ніяк не сутыкнуцца на лічбе 12? Мяне ўсе гэтыя прамаруджванні, недакладнасці хвалююць, раздражняюць, абураюць і, шчыра кажучы, непрыемна здзіўляюць. Во, як сцвярджаюць астролагі, свіння — жывёліна даверлівая, безабаронная, цярплівая, і грэх з першых жа крокаў зводзіць яе ў зман...

А пакуль вы чакаеце, мне вельмі хочацца з вамі пагаварыць. Пра што? Не мае значэння. Тэма можа быць любая. Можам гутарыць пра паэзію ці космас, адраджэнне ці кітайскую медыцыну, пра лячэнне іголкамі аблысення альбо дэмідролам — заікання. Да прыкладу, даў дзве дозы — і нічога, праз хвілін трыццаць нават храпака не чуваць, не тое, што заікання...

Я цяпер уся — вялізны паветраны шар, ува мне клякочуць словы, фразы, афарызмы, эпіграмы, якія патрабуюць неадкладнага выйсця. Сінонімы й антонімы, дзеепрыслоўі й назоўнікі, паронімы й інверсіі так і лезуць з мяне, як тыя дзьмухаўцы па вясне з зямлі.

О, нам шмат аб чым трэба пагаварыць!

Хоць бы й пра тыя ж дробязі. Давайце не будзем у новым годзе хваляваццa з-за ўсялякай драбязы: камусьці не хапіла сасісак у краме, а кагосьці там жа аблічылі аж на трыста «зайцоў». Не рабіце з ежы культу, а з грошай — лёсу. Можа, той, хто з'еў вашы сасіскі альбо забраў вашы трыста рублёў, адчувае сябе яшчэ горш — не спіць, небарака, варочаецца, па начах прывіды бачыць, пякотка яго даймае, пячонка трывожыць, міліцыянты ды пракуроры мірсцяцца...

Не тужыце і не зайздросце!

Што з таго, што ў вашай суседкі французскае манто і аўстрыйскія боцікі? Затое муж ейны — просты мяснік!

Ну і няхай сабе ў дзядзькі Хведара дача са шкла і мармуру, затое ён — просты вартаўнік на будоўлі, а вы — вядучы інжынер у інстытуце!

І напляваць на інтэр'ер Ніны Іванаўны з яе экстэр'ерам-медалістам! Затое ў вас спальны мяшок на балконе і здаровы колер твару... І ад інфаркту вы кожную раніцу ўцякаеце аж за дзесяць кіламетраў. А за год?.. Падлічылі? Вось так!

Давайце ў новым годзе будзем добрымі й ласкавымі, пяшчотнымі й вясёлымі, каб усе мы з радасцю спяшаліся на працу і з трапяткім хваляваннем вярталіся — да жонкі, мужа, дзяцей...

свекрыві й цешчы. Каб нашы мужчыны кахалі сваіх сяброваак, нягледзячы на падгарэлы суп, а жонкі не параўноўвалі сваіх мужоў з Іванам Іванавічам з пятага паверха, які й шпалеры клеіць, і дываны выбівае. Было б што выбіваць і дзе клеіць, астатняе — прыкладзецца.

З годам Свінні вас, спадары й спарадыні, таварышы й таварышкі! Усміхнемся адзін аднаму, пасмяемся з саміх сябе — і палягчэе. Перажывем усе нягоды, інфляцыі — абы не засвінячыцца, не зарохкаць па-свінску.

Было б над намі блакітнае неба, чыстае паветра, былі б у кожнага з нас сумленныя вочы, шчырыя ўсмешкі, а галоўнае — мір і дружба на зямлі. Каб у год Свінні нас напаткаў шчаслівы лёс!



# КАРАЦЕЛЬКІ БЕЗ НАЗВАЎ

* * *

— Федзя, адкуль у цябе сіняк пад вокам?

— Ведаеш, ішоў увечары дадому, ліхтары не гарэлі, а побач — штыкетнік... І раптам — кошка...

— Праўду казаў мудрэц, што лухта патрабуе шмат слоў.

— Не-не, я цвярозы быў!

* * *

— Доктар, прапішыце мне самы лепшы сродак ад сіняка пад вокам.

— Самы лепшы — гэта цёмныя акуляры.

* * *

— Дзімачка, а чаму ў вас дома аж два тэлевізары?

— Адзін — татаў, другі — мамчын.

— ?..

— Па адным увесь час футбол паказваюць, па другім — серыялы.

* * *

— Скажы, ты — хлопчык ці дзяўчынка?
— Не ведаю.
— А як цябе завуць?
— Саша.

* * *

— Марыя Іванаўна, што з вамі?.. На вас проста твару няма.

— Ой, не кажыце... Я згубіла ўчора сваю касметычку.

* * *

— Мая бабуля — як фея: у яе валасы блакітныя, зубкі залатыя, а ў руцэ — чараўнічая палачка.

— А мая — як чарадзейка: у яе валасы чорныя-чорныя, на ноч здымаюцца; зубкі белыя-белыя, усю ноч у шклянцы плаваюць... Калі выходзіць з дому, дык у руцэ заўсёды трымае вялізны парасон.

* * *

— Мае бацькі купілі мяне ў самым вялізным магазіне, шмат грошай аддалі.

— А мяне — за мяжой купілі, за валюту.

— А мой тата нават машыну прадаў, каб мяне купіць.

— А мы жывем бедна, у нас грошай няма, і мяне тата сам зрабіў.

* * *

— Доктар, скажыце, што горш: ОРЗ, ІХС ці ХПН?

— Ну, гэта з розных опер.

— Во! Ужо да гэтых хваробаў і пахавальная музыка ёсць?

* * *

— І ў каго ж ты на гэты раз закахалася?

— О, ён — будаўнік.

— Што ты, дарагая, яны ж такія грубыя, на язык нястрыманыя...

— Не, мой не такі — ён увесь час гаворыць мне толькі ласкава: майна — віра, майна — віра...

* * *

— Хлопчык, ты мне падкажаш, дзе выйсці... Я да Ратамкі еду.

— Добра, гэта яшчэ не хутка. Мне таксама ў Ратамку трэба.

— А ты куды ўжо бяжыш?.. Гэта — Ратамка?

— Не, гэта — кантралёр!

* * *

— Скажыце, гэта самыя вялікія капелюшы?

— Так, 60 памер.

— А там, далей, можа — большыя?

— А далей — у нас ідуць парасоны.

* * *

Скажыце, гэты сервіз сапраўды на шэсць персон?
— Не сумнявайцеся, на шэсць.
— Я таму і сумняваюся, што каштуе — як на дванаццаць.

* * *

— Хто за тое, каб даць прэмію за першы квартал Прысыпкінай?
— Так, яна лепей за ўсіх працуе, ветлівая, ціхая...
— Вы што?!. Трэба абавязкова Цурыкаву адзначыць! Яна такая скандалістка — увесь наш мясцком распыліць па свеце...

* * *

— Віталік, якія ты ведаеш ласкальныя суфіксы?
— ?..
— Ну, назаві некалькі слоў з ласкальнымі суфіксамі.
— ?..
— Добра, тады ўспомні, як звяртаецца твой бацька да маці, калі яна зварыць вельмі смачны боршч?
— Ты, налей яшчэ!

* * *

— Грошы могуць усё, — пахапкам, нібы ў апраўданне сказала Т.

— Так, грошы ўсё могуць... Яны зрабілі з вашага мужа п’яніцу, з сына — злодзея, з дачкі — прастытутку, з вас — спекулянтку, — падвяла вынік суддзя.

* * *

— Слухай, што ты ўвесь час тэлефануеш, але не размаўляеш?

— А гэта я сваю жонку кантралюю: калі кароткія гудкі — значыць абеду сёння не будзе, трэба ісці ў сталоўку.

* * *

— О, сёння быў самы выдатны даклад!

— Што, такі змястоўны?

— Не, вельмі кароткі.





# Змест


Джэнтльменскія пакуты .... 4
Інкогніта .... 9
Актуальная тэма .... 19
Юбілей .... 23
Бенефіс .... 27
Кроплі дацкага караля .... 33
Кнігалюбы .... 40
Бормуды .... 44
Тэст на свядомасць .... 48
Салон для цікавых людзей .... 52
Рэкорд .... 57
Неверагодны візіт .... 63
Вельмі адказная работа .... 67
Колькі жыве павук? .... 70
Калі хварэее немаўля... .... 73
Не закрывайце рот... .... 76
Марафет на халяву?.. .... 79
Імя табе — чалавек .... 88
Дарагія, пяшчотныя, мілыя... .... 90

Звычайныя прыгоды Авяр'яна Цэдзіка

Нетарыфная стрыжка .... 93
Абед на дваіх .... 95
Паўдзённы злодзей .... 98
Хіба гэта лішкі? .... 102
Задача .... 104

Непераможны .... 106
Прашу слова! .... 110
Карацелькі без назваў .... 113



*Літаратурна-мастацкае выданне*

Макарэвіч Сафія Аляксандраўна
Салон для цікавых людзей
Гумарэскі

Рэдактар *А. Масарэнка*
Карэктар *Л. Ражкова*
Камп’ютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*
Вокладка *Т. Чарновай*